Istniało jednak najważniejsze z najważniejszych źródło odrębności białoruskiej literatury polskiej. Tak, był i jest nią odrębny świat Kraju Białostockiego, tak różny od polskiego i białoruskiego. Zmieniają się, oczywiście, jego parametry, lecz on trwa. Białoruś dalej jest inercyjnie sowiecka, choć system sowiecki – sowiecki kosmos – dąży do nieuniknionego rozpadu. Kraj Białostocki tylko niecałe dwa lata pozostawał sowiecki (październik 1939 r. – czerwiec 1941 r.). Ślady duchowe sowieckiego władania u nas są wyłącznie mroczne. Z drugiej strony promieniała i promienieje Polska, która – bez względu na także ogólny dla nas brak atrakcyjności – jednak we wszystkich planach przewyższa sowiecko-białoruskie czy sowiecko-rosyjskie standardy. To prawda, nikt nas nie pytał, czy chcemy znaleźć się w Polsce. Ale gdyby doszło do czegoś na kształt referendum, jego wynik byłby bez wątpienia bardziej korzystny dla Polski, o czym świadczy całkiem marginalna repatriacja białostockich Białorusinów do ZSRR, bliski zeru efekt działań komisarskich agitatorów w latach 1944-1947. Gorzko smakowała „narodnaja ułada" po 17 września.

Z perspektywy warszawsko-polskiej Kraj Białostocki jest kontynuacją ekonomicznie deficytowych przedwojennych Kresów, stale obciążających państwowy budżet. Gdy w przypadku dołączenia do Polski terenów poniemieckich wzdłuż Odry i Bałtyku wysuwało się argument o ich gospodarczym znaczeniu, przy granicy polsko-białoruskiej znaczenie miał jedynie białostocki węzeł komunikacyjny i przydzielona Polakom... część Puszczy Białowieskiej (według wspomnień ówczesnego premiera Osóbki-Morawskiego, ugadującego się ze Stalinem). Ta nasza ekonomiczna nieistotność w systemie Państwa Polskiego warunkuje tę osobność świata Kraju Białostockiego od kierunku zachodniego.

Żyje nasz region tak, jak potrafi, tak naprawdę nikomu niepotrzebny, i ma literaturę, nie taką znów biedną. Duchowość zaś samej Białorusi, rozwinięta w okresie „Naszej Niwy", cudacznie powykrzywiała się w stuleciu ideologii i totalitaryzmów. Na jej międzywojennym zachodzie „bal prawiła" Komunistyczna Partia Zachodniej Białorusi. Identycznie rzec można i o Kraju Białostockim, lecz nie dalej niż do czerwca czterdziestego pierwszego. Samokompromitacja systemu sowieckiego jako niewolniczego dała wynik taki, że Polska, ta już w pełni cudowna Polska Ludowa, widziana była jedynie w pozytywach (bez powszechnych aresztowań, rozstrzeliwań i Sybiru). Indoktrynacja – także

cenzorska – pisarzy nie miała u nas cech terroru i nikogo nigdzie nie wysyłano z powodu niezgody na oficjalne wytyczne. Z rzadka degradowano kogoś służbowo albo ograniczano mu wolny zarobek. Białoruska literatura polska dojrzewała w atmosferze względnej swobody w sensie zawartości utworów i pełnej wolności w sensie jakichkolwiek tak zwanych formalizmów (eksperymentatorstwa).

Nasuwa się, wreszcie, pytanie, o nieuniknioności powstania polskiej literatury białoruskiej. Choć jest ono bardzo ahistoryczne, warte jest rozpatrzenia, ponieważ pogłębia rozumienie takiego zjawiska. Co ważne, warto pamiętać o nienarodowym, a czysto socjalnym charakterze Republiki Białoruś, jej imperialnej prowincjonalności, programowym ignorowaniu białoruskich narodowych enklaw w „bliskiej zagranicy" (Białostocczyzna, Wileńszczyzna, Smoleńszczyzna). Generalny cel polityczny ZSRR miał się wieńczyć likwidacją nacji i przetworzeniem ich w nową całość etniczną, mianowicie: od sowieckiego narodu do sowieckiej nacji. Wedle światowych analogii w postkolonialnych krajach Afryki, Ameryki Łacińskiej, południa Azji. Gdy się trzymać koncepcji przyszłej sowieckiej nacji – polska białoruska enklawa wypadała z pola widzenia Białoruskiej SRR. Gorzej nawet: była niewygodnym elementem w harmonii stosunków sowiecko-polskich. Na polską mniejszość białoruską u nas Moskwa (Mińsk był jej politycznym przedmieściem) patrzyła tylko w kategoriach interesów międzynarodowych, jak na platformę przeciwdziałań, ewentualną w przypadku niepomyślnego rozwoju wydarzeń w Polsce. Rozpatrywani byliśmy nie wyżej dywersyjnych potrzeb imperium, szczerze nacjonalistyczni działacze w Kraju Białostockim tajemniczo znikali, jak się potem wyjaśniło, w wyniku akcji sowieckich służb specjalnych. Stabilizacja ustroju Polski Ludowej kończyła okres szczególnego zainteresowania polskimi Białorusinami ze strony polityków; miały miejsce próby minimalizacji struktur ich narodowego życia, jednak nie w sowieckim stylu terroru państwowego (nakazów bądź ukazów). W Polsce praworządność pozostaje jednak ponad urzędniczą samowolką. Zawsze istniała możliwość obrony siebie, a nawet i wygranej, zwycięstwa w konflikcie. Wciąż pulsowały, choć ze zmiennym napięciem, dawne tradycje demokratyczne. Wiadomo, kultura realizacji prawa zależy od kultury jego wykonawców. Cóż z tego, że nawet tzw. Konstytucja Stalinowska była w istocie najbardziej demokratyczną w świecie (Wielka Brytania po dziś dzień obchodzi się bez konstytucji, i cóż, nie narzeka).

Tylko w jednym przypadku nie doszłoby do powstania białoruskiej literatury polskiej, a mianowicie w sytuacji braku głuchej ściany między Związkiem Radzieckim a Polską Ludową, a granicy w stylu zachodnim. Takie rozwiązanie nie było jednak możliwe ze względu na niepodobieństwo ekonomii, a przede wszystkim poziomu bytu (Polskę czekałby los Estonii, Łotwy, zalanych ludnością rosyjskojęzyczną).

Jednocześnie cywilizacyjny proces Kraju Białostockiego był i nadal jest najniższy w państwie, nawet w porównaniu z mazowieckim pasem na zachodzie województwa. Z jednej strony to znakomicie konserwowało etniczność nacji, lecz z drugiej źle wpływało na adaptację przez nią współczesności, co w końcu doprowadziło do masowej migracji do wielkich miast w poszukiwaniu życiowego przytuliska. Powszechna polonizacja nabyła teraz cech samopolonizacji, emigranckiego wtopienia się w tło i warunki.

Polska literatura białoruska pozostanie literaturą języka białoruskiego. Jej polskojęzyczność jest niefunkcjonalna poprzez ciągłą żywotność samej ludowej białoruszczyzny, także i peryferyjność niewielkiego terytorium, zamieszkanego przez tę mniejszość. Polskojęzyczność równać się będzie jej historycznej śmierci, degeneracji jej do polskiego regionalizmu. Polonizacja odbywała się i odbywa bez tej zajadłości, jaką widzimy u rusyfikatorów Republiki Białoruś. Po prostu – nie ta skala; Kraj Białostocki dla Warszawy to drobnostka, nie warta uwagi w znaczeniu politycznej znaczności.

Polska literatura białoruska będzie istnieć kontrastowo na tle całkowicie rosyjskojęzycznej samej Białorusi, której rusyfikacja już jest bezpowrotnie zakończona. Pamiętajmy o samej naturze języka – gdy znika on, więcej już nie ożyje (jedyny przykład, jaki potwierdza tę prawidłowość, to Izrael, gdzie administracyjnie ożywiono iwryt). Wraz z odejściem w niebyt pokolenia, pamiętającego melodykę białoruskiej mowy, język białoruski przetworzy się w wyłącznie dekoracyjny i liturgiczny (kto dziś da rękę, jaka była intonacja antycznych Rzymian?).

Jeśli rzeknę, że przyszła rosyjskojęzyczna literatura białoruska zniży się do rosyjskiej prowincjonalności, to chcę przez to podkreślić niepowtarzalność narodowego języka jako systemu oryginalnej filozofii świata i człowieka. Białoruska mentalność – nie jest ani polska, ani rosyjska. Pisząc po polsku, hodujesz w sobie Polaka. Pisząc po rosyjsku, hodujesz w sobie Ruskiego. Jaskrawo nam to tłumaczy całe doświadczenie Europy, w której na przykład możemy mówić o pisarzach areału języka francuskiego, określając dokładniej, który z nich jest francuski, belgijski, szwajcarski, luksemburski, kanadyjski. Centrum inicjacji leksyki francuskiej leży w Paryżu, a nie w Brukseli czy w Genewie. W pisaniu rosyjskim, chcemy tego czy nie, automatycznie orientujemy się na Moskwę, a nie na Mińsk czy Homel. Język rosyjski – to także rosyjskie a nie białoruskie widzenie świata. Nie rozliczając się z tym wszystkim, nie zrozumiemy sensu literatur narodowych.

Białoruska rosyjskojęzyczna literatura nie przeżyje białoruskiej państwowości, zniknie wraz z nią. Polska białoruskojęzyczna jest wieczna, bo niepodobna jest do niej, a dokładnej – nie jest taka sama. Mówi o świecie i człowieku ideami i kategoriami słowa białoruskiego, jego gramatyki. Brać w obronę język białoruski – to bronić swego losu i swego stylu życia. Wreszcie – swojej perspektywy.

Z białoruskiego tłumaczyła **Mira Łuksza** ■

Беларускае Літаратурнае Аб’яднанне „Белавежа” 1958-2013

Антось з Лепля

Шляхецкія госці

У Залыччы сёння незвычайны дзень. Старыя і малыя шляхцянкі нешта асбліва жвава бегаюць, круцяцца, мітусяцца. Ідуць зборы. У госці да Чуб-Цяпілаў. Тыдзень таму назад тыя праз парабка прыслалі паперу, у якой пісалася:

“Паважаныя і шаноўныя паны Лычкоўскія! Запрашаем абавязкова быць у нас, значыцца, у Чуб-Цяпілаў, на Усіх Святых, першым днём, у гасцях. Шмат хто бэндзе сабраўшысень. Бэндзе выпіўка і квашаніна, а і кілбасы, а і капуста са смятанай, а і парасёнак у масле, а і сырнікі ў тлустасці... А на астатак падаме або бліны аўсяныя з гусіным шмальцам, альбо кісель аўсяны з маслам, ці яблыкі з... млекам.

Спадзяёмся, жэ бэндзеце напоўненыя ўсім усякім, а і задаволеныя бардзо вшысткім ад’едзеце ад нас, паноў

Чуб-Цяпілаў, да свайго Залычча.

З вялікім паважаннем чэкаць будзем паноў Лычкоўскіх. Чуб-Цяпілы”.

Пасланне атрымана ад старога шляхецкага роду, дык і не дзіва, што ў паноў Лычкоўскіх кіпела ў будынку, як у катле.

Сама пані Лычкоўская, высокая, прыгожая, поўная жанчына падганяла нізкага кульгавага пана.

— Ну што ты куёўдзішся?! Хутчэй збірайся!

Сын іхні, Мамерт, гадоў 24, пакрыкваў на сястру Уршулю, прыземістую, круглую маладзіцу, на год старэйшую за яго:

— Уршуля, дзе штаны? Уршуля, падай шлейкі! Уршуля, дзе падзела мае панчохі ды калёшы?

Стаська, яе муж, худы, спрытны гарадскі чалавек (на чыгунцы нейкую службу меў), таксама спрыкрыўся Уршульцы сваімі енкамі. То яму хустачку падай, то капялюш знайдзі, то грошай дай у дарогу, бо іх Уршуля трымала ў сваіх руках.

Але пад вечар-ткі ўсё сціхла. Пані села з Мамертам на калёсы, у якіх былі днямі гной у поле вывозілі, Уршуля, са сваім Стаськам, — угнездзіліся на каламажцы, на той самай, на якой кожнае свята ў касцёл ездзяць.

— Но-о-о-э!

Паехалі...

Сціхла ў Залыччы. Дзе-нідзе толькі курыца засакоча, або певень запяе, ці сабака прагаўкае.

Туп... туп... тупа-туп... — бяжыць конік, цягнучы калёсы. Туп-туп... за ім другі, запрэжаны ў каламажку.

А тым часам гаспадар Залычча, які застаўся дома, сеўшы ля акна ў “салёне”, узлажыў на нос акуляры, узяў кніжку і стаў узносіць малітвы Богу за сябе і за тых, хто паехаў у госці.

Туп-тупа, туп-тупа-туп... аддаляецца і заціхае конскі цокат.

Туп-туп, тупа-туп... лёгка коцяцца калёсы і каламажка.

Паволі то зближаюцца, то ўцякаюць ад іх прыдарожныя бярозы. Мінаюць поле за полем, лужыну за лужынай, мост за мастом.

Калышуцца і ўздрыгваюць на калдобістай дарозе павозкі, хістаюцца ў баку смачна дрэмлючыя седакі.

Тупа-туп... тупа-туп... – без канца адбіваецца з гасцінца.

Раптам чуюць: “гаў! гаў!” Недзе блізка забрахалі сабакі.

Прачнуліся седакі. Мамерт знянацку затрымаў каня, здрыгануўся, саскочыў з калёс і стаў нешта шукаць.

— Зноў пугу згубіў? — пытае маці.

— Пугу...

Гэта здаралася з ім кожны раз, як толькі выпраўляўся ў госці ці ў Дзісну.

Пані-матка была разумнай жанчынай. Яна з усмешкай зірнула на сына і сказала:

— Можа вёрст пяць назад згубіў... не варта шукаць, даедзем як-небудзь

Мамерт адламаў алешыну і, не абцерабіўшы галля, узмахнуў ёю над канём.

— Но-о-о-э!

Праз хвіліну яны павярнулі на панадворак паноў Чуб--Цяпілаў.

Сустракаць выйшаў сам гаспадар, малады і смешны дзяцюк гадоў трыццаці, з вялікім падбародкам і скрыўленаю губой. Коней з павозкамі ўпарадкавалі, рэчы якія, перакуску, сеннікі і сядзенне, і клункі паны Лычкоўскія пазабіралі з сабой у хату. Алешыну-паганялку Мамерт схаваў ля плота.

У хаце было поўна паняў, паноў, паненак і панічоў. Размясціліся ўсе купкамі па кутках. Старыкі сабе, старухі сабе, дзецюкі і дзяўчаты — асобна. Усе ціха перагаворваліся, не заўважаючы новых гасцей.

— Пахвалёны Езус Хрыстус! — загаманілі прыбыўшыя, калі са сваімі вандзэлкамі ўваліліся ў хату.

— На векі векуў! — загукалі з куткоў.

Гаспадар і гаспадыня завіхаліся ля Лычкоўскіх, дапамагаючы пані-матцы вызваліцца з коўдраў, хустак

і шнуровак, ватовага і "на мяху" паліто. А калі знялі валёнкі, тады ўжо яе вялі і знаёмілі з сядзеўшымі. Нарэшце пасадзілі на пачэсным месцы. Мамерт, Уршуля і Стаська самастойна перазнаёміліся з усімі і сталі ці селі, дзе каму спадабалася, у хаце.

Шэпат і шоргат узмацніўся было, ды тут і заціх, калі гаспадар выйшаў на сярэдзіну хаты і голасна прагаварыў:

— Паважаныя дарагія госцікі! Болей ніхто не прыедзе да нас, будзем брацца за справу! Сталы паставімо на сярэдзіне хаты. Пад'ёмо спачонтку, а потым бэндзем забаўляцца!

Падняліся ўсе хлопцы, зашумелі, зарагаталі, загрукацелі лаўкамі, зэдлікамі і сталамі. З кухні, з шафаў і скрынак тры сястры Чуб-Цяпілішкі насілі і насілі на сталы, накрытыя белымі абрусамі, усялякія прысмакі.

Урэшце, усе госці былі прошаны садзіцца — пачалося частаванне.

Пілі гарэлку, ды закусвалі, чым хто хацеў. А ўсяго было на стале: была тут вяндліна, ніхто не помніў, калі вяндзоная, ды такая цвёрдая, што цяжка было адкроіць кавалак: не браў нож, не бралі і зубы, ну што тая падэшва... А гаспадарам лацвей: яно і паказна, і эканомна.

Была і квашаніна дужа смачная, капуста смажаная і ў смятане, кісла-салёныя агуркі, беларуска-шляхецкія кілбасы, таксама шынкі, парасяты, куры і пара зайцоў, штукаваных салам. Усяго не пералічыш!

Пасля падалі некалькі вялікіх місаў крупені, варанай са свінінай, бліны і Бог ведае, якія яшчэ прысмакі.

Пілі ды елі шляхцічы і шляхцянкі, елі ды пілі, тыркаючы пальцамі ў бруха: "Ці не досыць ужо?"

У хаце зрабілася душна. І ад выпітага, і ад таго, што вокны і ўзімку і ўлетку былі наглуха забітыя, з прычыны вялікіх марозаў узімку і плягі мух улетку. Ад добрага і шматлікага пачастунку гасцей ахапіла парнасць.

Гаспадар бы чакаў толькі гэтага моманту, устаў з-за стала і агаласіў:

— Пшэпрашам, панове! Чым былі багаты, тым і дзяліліся! Выбачайце, калі што не так!

Госці загрукчэлі табурэткамі, засоўгалі зэдлікамі і пачалі падыходзіць да пана і паненак Чуб-Цяпілаў дзякаваць.

— Дзякуем! Ой, дзякуем! — казалі яны, цалуючы гаспадароў па чарзе.

Чуб-Цяпілы толькі і сыпалі ў адказ: "Няма за што..."

Але скончылася гэта. Сталы і зэдлікі рассунулі па кутках, хата зрабілася прасторнай. Завялі грамафон, які даўно чакаў на камодзе, і пайшлі ў танец. Адчынілі хату і сенцы. Знадворку пацягнула халодным паветрам і асвяжыла ўсіх. Усе пачулі сябе ажыўлена-гарэзнымі, вясёлымі..

Між іншымі, з Няміранкай старанна скакаў Мамерт, хоць мешкавата выглядаў у танцы; Уршуля была ў модзе ў маладых хлопцаў, але сам крывароты Чуб-Цяпіла прычапіўся да яе, бы прырос, і гарэзліва скакаў з ёю "Лявоніху". Постаць яго неяк дзіўна перагнулася: ногі і галава аддзяліліся ад Уршулькі, а талія прыгарнулася вельмі блізка. Скрывіўшы твар на бок, пан прыпяваў нешта вясёлае і моцна тупаў нагамі. У той час муж Уршулькі, Стаська, зачаў спрэчку аб палітыцы з нейкім старым. Пані Лычкоўская раіла камусьці, як лячыць уздутую жывёлу...

Гамонка, шум, гвалт, грукатанне, скокі, спевы, грамафоннае хрыпенне, гопканне — цягнуліся далёка за поўнач. Весела было ўсім...

Пад самы ранак зноў паставілі сталы пасярод хаты. Расселіся, як і раней. Як было дакляравана ў запрашэнні, гаспадыні прынеслі бліны з гусіным шмальцам, кісель з маслам, пячоныя яблыкі з салодкім малаком.

Елі добра, не слухаючы і нават не пытаючы згоды ў бруха, бо кожны ведаў, што дамоў ужо не прыйдзецца ехаць верхам, скакаць не трэба, дык няма патрэбы і лёгкасць захоўваць. Не адставалі ў гэтым перакананні ад іншых і паны Лычкоўскія. Ды і што ім? Яны ж сюды не верхам прыдбаліся...

Туп-туп-туп-туп... — стукалі падковамі конікі з Залычча, везучы ў калёсах Мамерта з маткай-паняй і, у каламажцы, ззаду за імі, Уршулю са Стаськам.

Цёмна. Прыскае дожджык. Часам галінкі беразняку мякка сцёбаюць седакоў па разгарачоных тварах. Ім гэта прыемна. Яны, укруціўшыся, дрэмлюць, гойдаюцца...

На п'яную галаву, Мамерт скіраваў каня на бок, дзе была калдобіна з вадой... Раптам... нехта вякнуў і змоўк. Пярэднія спыніліся. Даносіцца шорах, сапенне...

"Што гэта? Ці не разбойнікі!" — думае Стаська і прыглядаецца.

Не. Гэта пані-матка, дрэмлючы, занадта раскалыхалася ў бакі і калі конь звярнуў з дарогі, дык яна, як пампушка, як клубок, уся абвярчаная коўдрамі і хустамі, звалілася ў калдобіну і з перапуду войкнула.

Саскочыў Стась, адшукаў цешчу і мокрую выцягнуў з вады. Мамерт і Уршуля трымалі коней. Усадзілі паню-матку ў калёсы, уздыхнулі некалькі раз з прычыны гэтай нагоды і рушылі далей...

Туп-туп, тупа-туп... — конікі тупалі, мерна везучы ў Залычча сваіх гаспадароў.

Некалькі вёрст праехалі ціха, без здарэння.

Вось ужо вёска Азаднікі. З'ехалі ўніз, мінулі мост.

Дарога пайшла ў гору.

Раптам... Што гэта?! Задні конь стаў, бо напхнуўся на калёсы.

— Ты што, заснуў там?! — крычыць Стась Мамерту.

Адазвалася і пані-матка:

— Конь з пярэдняй парай калёс неяк адчапіўся і пайшоў!..

— Што гэта такое?! Чаму?! — трывожна пытаўся Стась.

— А нічога, — спакойна казала матка, — гэта шворан выехаў, дык і асталіся... але, дзякуй Богу, здаецца, вунь і Мамерт вяртаецца ўжо з канём! — закончыла яна.

І праўда, хутка прыйшоў Мамерт і прывёў каня.

Стась злез з каламажкі, дапамог Мамерту...

Ехалі далей. Сон прайшоў, холад, перапалох спугнулі

яго...

Туп-тупа, туп-тупа, туп, туп, туп...

А вось і свет бліснуў з акна ў фальварку Залычча. Гэта стары пан Лычкоўскі, з работніцай і парабкам, пры лямпе адпраўляюць ружанец за шчаслівы зварот сваіх родных.

Чу! На двары зарыпелі калёсы і затарабаніла каламажка. Схамянуўся стары... “Вось і яны, дзякуй табе, Божа!” — сказаў, і, паспешна кульгаючы, заспяшаў адчыняць дзверы.

1958

Сакрат Яновіч
Навальніца на хутары

Як толькі я памятаю, навальніца заўсёды прыпаўзала з-за Прафіткі, гары, ад якой пачынаецца даліна накшталт вялізнай місы, а наша хата ў ёй — быццам тая нясмачная скварка, сасмажаная на вугельчык. Хата ўсё больш і больш горбіцца, а мой бацька праз цэлае сваё жыццё збіраўся закласці пад яе новыя падрубы і перад смерцю даверыў гэту справу мне, маладому гаспадару. Падумаў я, ці часам не дзед збіраўся з тымі падрубамі...

З Прафіткі збягае ўніз шаша. Яна нырае ў зялёныя чароты, што над рачулкаю, у якой іншы раз плюхаюцца голыя дзяўчаты, і шнуруе, бытта што ўкраўшы, пад другую высокую гару, якая нагадвае паднябесную траншэю, якраз насупраць Прафіткі. Значна вышэйшую за яе.

Пад тою гарой, што значна вышэйшая за Прафітку, часта псуюцца аўтобусы далёкіх маршрутаў, і тады можна бачыць, як сумуюць пасажыры, чакаючы адпраўкі.

Пад вечар сапраўды за Прафіткаю пачуліся грымоты і па шашы засняжыў пылок — як бы молаты цукар, калі тайком зжыраеш у каморы дзівосную матчыну мазурку, падрыхтаваную на вялікае свята.

Пакуль чуб хмары высоўваўся і высоўваўся, пакуль паказалася даўно не голеная фізіяномія буры з зубялямі бліскавіцаў, фізіяномія, якая тры дні не ела, выбзыкнуў перад самюсенькім носам яе, з па-за Прафіткі, адурэлы аўтобус і так памчаў уніз, так прашапацеў ён праз чароты, у якіх ужо намачыў пад сябе масток, так скакануў на паднябесную траншэю, быццам заяц з рассадніка, што здавалася: вось і канец свету!

Стрэхі поўныя птаства: галак, шпакоў, вераб’ёў. А пад стрэхамі сцішыліся куры. Свінкі неспадзявана разбрыкаліся па агародзе радасцю рэкрутаў на апошняй забаве ў вёсцы. Спахмурнеў задуменны конь. Прыціхлі каровы, не кажучы ўжо пра авечак. Паветра набрыняла надзеяй, што хата ўсё-такі будзе плысці, яна ж драўляная, кожнаму хопіць кавалак чагосьці...

Маці зачыніла акно і перахрысцілася.

Па небе прайшоўся чорт з віламі, выгінаючыся ад рогату, быццам старая п’яная дзеўка. Аўтобус жа, калі не пагубіў сваіх вісклівых апонаў, напэўна, сядзіць цяпер у нейкім гаражы ды плюскае шклянымі бельмамі гультаяватага сабакі. Вёз ён пасажыраў, бы бобік кашку на хрыбце: палёгку меў пры хуткім бегу, вельмі хуткім, да таго хуткім, што даходзіла да рэдкай хвіліны згоды. Прапаў за траншэяй!

Ну!!!

У пекле апынуліся мы ноччу. Сядзелі на самюткім яго дне. Над намі дагараў свет. А мо гэта ўсяго толькі ўсмешкі чарцей-чарцянят, што схіліліся над намі ды спрабуюць убачыць, што з намі? Маці малілася штораз гучней.

У суседняй вёсцы пачаўся пажар, асвятліў шыбіны, ніткі дажджу, дрэвы, выгнаных на загуменне кароў і каня, плот, каменні... Я выбег на парог і глядзеў на пажар пад перунамі, і цешыўся ім, як чалавек, якому пасля цяжкага здарэння сказалі, што будзе жыць! Што свет існуе!

1969

Сакрат Яновіч
Одум

Пасля вайны вялікае мы школы паканчалі заядла і, усе да апошняга, дарослымі ўраз зрабіліся. І на работу ў гарады трамваезвонныя ды з тратуарамі франтаватымі, бы на фэст які вяселісты пайшлі-паехалі. Грошы ж свае мелі, яшчэ з малаком на губах будучы, во дзіва цуднае было над дзівамі! Так працавалі там і ў якія толькі хочаш змены, што сам Сізіф той пры нас гультаём здаўся б... Не з аднаго страху парабка, што маўклівым кватарантам споўдаўся ў кожным з нас, — а каб не турнуў хто на галытву тую бацькоўскую назад. За шанц жыць потым, як у байцы, браліся сутаргава, неадчэпна.

Мы палічылі, што мінулае сваё басаногае, дзякаваць Богу, у дурнях пакінулі спрытна, таму сэнс усякі без нас або не ў нашым новаздабытым уявіўся тады да абсурду немагчымым, часам няхай сабе смешным усяго да сакатлівага рогату. Маці задрыпаная з бацькам зацюканым, усё роўна што памылка несусветная лёсу людскога, у глухамані забеластоцкай беспатрэбна гароўна карпелі. Свет цэлы не бачыў чагосьці такога з маладымі ды й найстарыя са старых не зведалі аніколі. Як жа лёгкакрыла ішлося ў часы тыя і ў нагу несумненна жа ж!

Ой, стараліся мы ды перастарваліся, не ў прыклад кажучы, быццам дзеці малыя, якім цацкі за тое навюткія і фабрычныя, нікім не кранутыя, далі на свята прычаканае ўрэшце. У захапленні гэткім ад таго, ажно да першабытнага самазабыцця зацьменнага, у якім год за годам нам гады замільгацелі ўвачч на падабенства лікаў тых выйгрышных на рулетцы нейкай азартнай. Стаўкі тадышнія на карту нашу запаветную дазвалялі пакуль на няшмат, спачатку на абноўку чаравічную, а потым і на касцюмную, з зашпількамі фарсістымі-серабрыстымі. Ну й разжыліся ж радасна і сяк ды так на мэблю блішчачую і на кватэры жаданыя з пакоямі гардзінна-шырокаваконнымі. А й унучанятамі, як анёлкамі,

дзеда з бабкай з рукамі парэпанымі пацешылі мы па-панску для шыкоўнасці пад тайны свой комплекс хама на паркетах.

Дзяцей пагадавалі ж мы так, быццам яны былі не нашымі, а прысланымі ад паноў нам даўгапамятных на ўтрыманне смачнаежнае і выхаванне фінціклюшнае. Раслі панічамі і паненкамі ў нас на хвалу усё-такі вясковую, і вазілі ж іх туды што ні свята, у дрымоцце тое прыгуменняў, на паказ абавязковы дзеля цётак з дзядзькамі, а і зайздрасці прыемнай ад суседзяў у заплоцці. Лялькамі разадзетымі і шпанюкамі, якім толькі малака птушынага не хапала!

Як кажуць: і азірнуцца не паспелі, калі сівізна пасыпалася на галовы нашы інеем прымаразку першага і вочы заімгліліся стомаю пасля дарогі такой пыльна-доўгай, малапраезнай яшчэ ў тое вандраванне наша. Песні тыя, што спявалі мы ў вёсны маладыя і ў леты квяцістыя, рэхам беспаваротным адляцелі на той свет, а словы родныя з родных цяпер непатрэбшчынаю на гарышчы хаты або ядлоўцамі на палях удзічэлых старонння сардэчнага; душы ў пустапаш пустазельную выradзіліся. Бацькоў сваіх вось крадком пахаваўшы на могілках, бяспамяццю зарастаючых за палеткамі пакінутымі, а дзяцей шумна ў зямлю абяцаную альбо ў Амэрыкі выправіўшы з кашалькамі тугімі, агледзеліся і самі век дажываючымі, каратаючымі дзень да вечара ды над фатаграфіямі даўнімі галавою ківаючы... Адно неба засталося нязменна зорным і буры пераджніўныя гэтак жа памаладзецку грымотныя ды захады ў задуменні назаўсёды ціхім барвовыя, і маладзік месяца ў ноч Пятра і Паўла, бы перад колішнімі зажынкамі, цярпліва напамінаючы з нябёсаў над нашаю айчынай зараз пустыннаю, што без сярпа перш не было б хлеба.

Як жылі, так і пражылі. І па законе старасці натужваемся думаць пра раней непрадчуваныя намі тысячагоддзі, разумеючы, хоць бессаромна позна, як блізка, аднак, адыйшліся мы наперад, нягледзячы на зразумелую і слушную гідлівасць нашу да існавання сярмяжнага пад стрэхамі саламянымі, пад якімі проста па-варварску былося. І добра, што прынамсі бяздарна ўяўляем сабе ўсё, колькі нам да спасціжэння неспасціглых Элады і Рыма. Ды пытаем самі ў сябе з сумненнем, як мудрасць: а як гэта нас успамінаць будуць і ці прыстойным словам?

1986

Міра Лукша
Ганавічнікі

Па-пад лесам, сярод палетак, засеяных тым-сім альбо і зарастаючых буяючым лабузіннем ды лясным самасеем, стаіць хата трох Ганавічнікаў. Коля, Косцік і Крысцё Назарэзікі — кавалеры, нестарыя. Жыць мусова, так сказаць, як набяжыць. Пакуль жылі маці Маня ды дзед Ваня, нейак жылося, пакуль не пераелі геркаўскія рэнты. Малодшыя крыху чыпелі ў Гайнаўцы, рабілі, пасля падтрымліваў быў іх і Курань сваім славутым „супам”. За абаронцаў простага люду хлопцы, як і ўсе ў вёсцы, паставалі б муром.

— Шкада, што памерлі, а то і сёння мы аддалі б на іх галасы! — кажа Косця і пацягвае проста з рыльца бутэлкі вішнёўку, адзін буталь ледзь за шэсць злотых. Вішнёўка „скляповая”, ведаеш, што п’еш, не тое, што рускі разбаўлены спірт ці Раяль. Ад такога дык толькі што гебнулі два маладыя суседзі. Напіліся ў кампаніі, заснулі дый не паўставалі. Нават іх і не памылі перад пахаваннем, бо не было як; паразгіналі акалеўных нябожчыкаў, пашукалі чыстых якіх ануч у шафах, і нацягнулі на транты нейкія летнікі ці не па дзеду, запакавалі ў труны аплачаныя гмінай грамадскай апекай, і адправілі на стары могільнік за вёскай, дзе ў свежых магілах пакояцца штораз маладзейшыя жыхары навакольных вёсак. О не, Коля, Косцік ды Крысцё да такога не даваліся. У параўнанні з хатай Паўлушыных дык іхняя сядзіба маецца як варшаўскі гатэль „Марыёт” да гміннай абрыганай забягалаўкі. Праўда, начуе ў іх народ, але за сваё ўсе п’юць. І спаць валяцца не на падлогу, а не тапчаны, канапы, ложкі, у пасцель, як людзі. Праўда, напалохаліся тады, пасля скону Паўлушыных хлопцаў, Ганавічнікі, нават не пайшлі развітацца, не то што каб у царкву ды правесці на могільнік. Першы раз, бо хлопцы радзінныя, свойскія — і ніякага вяселля не прапусцяць, і хрысцін, і мярлін. Спачуваюць, цешацца. Чалавек жа ж жывы, сярод людзей жыве.

Прыйшоў быў лось на падворак Ганавічнікаў. Калісьці, у лютыя зімы, жывёлы шмат наведвалася на падворкі, пад адрыны ды стагі, каб пакарміцца. Цяпер тыя зімы як не зімы. Чаго ласю было завітваць на падворак галодных гаспадароў? Можа, звабіла яго мычанне апошняй каровы ў напаўразваленай аборы? Зацяўкалі тры сабакі, накінуліся на звяра, загналі яго паміж шопкі. Схапіў Крысцё сякеру, Косцік нейкі лом... Загналі лася ў недапалены садок, запутаўся паміж галінамі старых яблынь. Мелі хлопцы мяса шмат, сабакі касцей. Скуру звалілі ў нужнік. Мусілі да ветру хадзіць за стадолу, бо тая акалелая ласёва скура тырчала з ямы над седала. Пакуль мароз трымаў, дык стаяла там дыба, не псавалася. А пасля і дастаць яе цяжка было, як пацяплела. І калі сталі стражнікі па вёсцы шукаць рыбалоўных сетак, нарваліся на той смярдзючы срач з хмарай мух. Пашукалі ў Ганавічнікаў больш дакладна — а тут у іх на гарышчы наступнае: абрэзы, пісталеты, стрэльбы-двухстволкі, набор спецназаўскіх нажоў... Калекцыянеры! — казалі. Нідзе таго ўсяго не ўжывалі. Мужчынская справа збіраць ружжо. Займаліся гэтым пушчанскія людзі здавён і заўсёды. Віну на сябе ўзяў найстарэйшы, Коля.

— То хоць у цяпле пажыве, — каменціруе Крысцё. — Добра накормяць. Тэлевізар е, камп’ютэр. Чалавек у турме развіваецца. Адно толькі, што няма як напіцца. То хоць будзе мець дарэмны „адвык”. А што бабаў няма... А што, тут можа іх маем?..

2008

Trymajciasa, naszy słowy!

(Ciąg dalszy ze str. 35)

Kadłyby. Nogi. *Kadłyby balać*: nogi bolą**.** Słowo to ma związek z polskim: kadłub. Czasem było używane w znaczeniu: kości. Inne słowo: **kałdyby (kałdobiny)** – oznaczało wyboje na drodze. Na nogi mówiliśmy też: **hiry.** W języku polskim został ślad po naszych hirach: giry. W rosyjskim giria to ciężarek. Mieliśmy jeszcze słowo na nazwanie ciężkich nóg: dyby i czasownik: dybać. *Jon padybaŭ kudyś. Nu, dybaj. Padniaŭ swai dyby i padybaŭ. A ty na dyby i da raboty.* Rosyjski czterotomowy słownik Dala notuje to słowo. W języku polskim mamy słowo: dybać, ale w znaczeniu: czaić się.

Kuzaka. Pełzający owad. *Jakijaś kuzaki poŭzajuć. A czort z hetymi kuzakami, niachaj poŭzajuć.*

Paszychawać. Poszczęcić się. *Ni paszychawało. Ni szychuja mnie. Trebo mieć szych.* W języku polskim odpowiednikiem tego słowa jest: fart. Mieć fart.(Mąż dodaje, że to ślad po pierwowzorze niemieckim: dobrze się pojechało). Obecnie mówi się: mieć farta.

Laskać. Trzaskać. *Laskać dźwiarami. Dźwiarami tolko lasnuŭ.*W języku polskim mamy pokrewne: łoskot. Niektórzy mówili: *loskać. Waknom loskać. Wakno loskaje*. *Zaczyni wakno* (zamknij okno).

Budziań. Dzień powszedni. *Odziawajaszsa u budziań jak u wielkaje świato. Budziony adzietak.*

Cadziłko. Kawałek lnianego płótna do przecedzania mleka. Słowo zachowane w potocznej polszczyźnie z okolic Tykocina jako: cedziłko.

Czortapałoch. Oset. *Tolki adzin czortopałoch tut raście*.

Kapersać. Szturać. *Ni kapersaj. Czaho jaho kapersajasz i kapersajasz*. Słowo zachowane w polszczyźnie okolic Tykocina jako: kopersać, i w tym samym znaczeniu. Ciekawostka: w tych okolicach do polszczyzny przeszło nasze słowo: **brachać (**szczekać), i brzmi: brzechać. W latach sześćdziesiątych ub.w. w Warszawie często słyszałam, że ktoś na kogoś nabrechał. Coś ty na mnie nabrechała. Sam nabrechałeś, i to na mnie.

Chabor (z akcentem na: o). Łapówka. *Chaborniki jany ŭsie. Jon tolko chaborniczaje. Chaboru zachaciełasa.* W białoruskim literackim istnieje w innej formie; chábar. Chábarnik.

Blejać. Zawodzić, miauczeć przeciągle. *Katy u was cały dzień blejuć*.

Bizun. Bicz. W języku prostym małolaty były nazywane bizunami. *Samyja bizuny tudy papierli.*

Drypać. Dreptać bez sensu. W polszczyźnie mamy: cipcia-drypcia. W języku prostym: *pipcia-drypcia. Zadrypałasa zusim*. Zadrypanka: zabiegana kobieta.

Świarbieć. Swędzieć. Notuję to słowo dla następującej uwagi: mamy je w języku polskim, w powiedzeniu: język świerzbi. Już tak prawie nikt nie powie.

Zjechau z hłuzdu. Ześwirował; odbiło mu.

Hanawicy. Portki. Tak mówiono w języku prostym, choć powinno być: nahawicy. Wszyscy mówili: hanawicy. Jakby chodziło o lekceważące traktowanie tej części ubioru. Hanawicy, i już.

Halina. Gałąź. Haljo: gałęzie.

Leszczotki lub leszczatki. Zacisk, imadło, szyny (med.) *U za ciesnych botach jak u leszczatkach. Jak u leszczatkach* – matka często powtarzała te słowa, mając na myśli nie tylko za ciasne buty, ubrania, ale i duszną atmosferę. *Ni budu ja żyć jak u leszczatkach*.

Naszparyć. Spuścić dziecku prędkie lanie. Wtrzaskać mu. Opamiętać się po niewczasie. *Naszparyŭ dzicia bez patreby*.

Cubanić. Gęsto bębnić (o ulewnym deszczu). Deszcz cubani. *Zaraz budzie cubanić. Uże cubani. Uże dożdż cubanić. Razcubaniŭsa*.

Atawa. Trawa z drugiego pokosu łąki. Pytam męża, czy zna to słowo. Nie zna. U nich pod Toruniem mówiło się o tej drugiej trawie: potraw. Oba słowa obecne są w języku polskim jako regionalizmy. Nasza atawa w języku polskim to otawa. Otawa była ciemniejsza od pierwszej trawy. Czasem wyższa. Nie było w niej tylu ziół, co w pierwszej trawie. Łąka z otawą wyglądała jak starannie utrzymany trawnik.

Parszuk. Wieprz. *Skolki parszukoŭ nahadawali?* Słowo obecne w gwarze polskiej (przypomnę: słownik tej gwary można znaleźć na: zgapa.pl).

Apałonik. Łycha wazowa. Słowo obecne w polskiej gwarze okolic Tykocina. Codziennie używaliśmy tej nazwy: apałonik.

Ahładki. Placki z mąki lub ziemniaczane.

Zaszpilić. Zapiąć. Zaszpilało się również guziki. *Zaszpili palto.*

Turzać. Szarpać. *Ni turzaj jaho*. Słowo obecne w polszczyźnie, w gwarze podlaskiej.

Bażycca, pabażycca. Przysięgać na Boga, przysiąc na Boga. *Jon pabażyŭsa*. On się pobożył. I po co się bożysz? *I na sztoż ty bożyszsza?* Słowo obecne w polskiej gwarze podlaskiej. *Jana nawat bażyłasa*. Po co się bożysz?

Za biazdurno. Za nic. Sprzedać coś za biezdurno.

Klikać. Wołać kogoś. *Paklicz jaho da chaty*. Obecnie klika się, siedząc przy komputerze. No to mamy klops. *Klikali jaho, a jon kudyś padzieŭsa*. Wykrzyknik w literackim białoruskim: klicznik.

Zaszczepki. Haczyki u okien i drzwi. Zawsze u nas były te zaszczepki. Jeszcze są w Narejkach, m.in. w chałupie,

gdzie odbywają się nasze zjazdy. Mały białorusko-rosyjski „Słoŭnik” (Narodnaja Aswieta, 1994) podaje to słowo jako: saszczepki.

Hryczanka. Kasza gryczana.

A nu jaho! Niech idzie do diabła!

Padwiaści pad durnoho chatu. Zrobić z kogo głupca.

Sztybli. Półbuty, najczęściej twarde, niewygodne**.** Albo od: sztybel (w jidisz: pokoik u chasydów) albo od: Stiefel (niem.: buty z cholewami). W slangu miejskim sztybel to cienias. Przedziwne bywają losy słów. Niektóre zawędrowały w ciemny zaułek.

Trumkać. Grać, nie posiadając słuchu, na instrumencie strunowym. *Jon trumkaje. Piarastań trumkać!* O wodzie też tak mówiliśmy, ale w sensie pozytywnym, miłym dla ucha. *Wada trumkała u naszaj reczcy. I jaszcze jana trumkaje*. Nasza woda trumka teraz: nikomu. Trawie.

Skibka i łusta. Kromki chleba. Łusta to była duża skibka.

Wyraj. Ciepłe kraje. W języku prostym przerobiliśmy ciepłe kraje na legowisko. Dodaliśmy do wyraju słowo: drychlać. *Cały dzień drychlajasz na wyraju*, czyli: cały dzień gnijesz na legowisku. Mieliśmy na myśli przyjemne legowisko, ciepłe, wygodne, rajskie.

Klinok. Bawełniany worek do wrabiania białego sera. Ktoś jeszcze wyrabia taki domowy ser? W sklepach pojawiają się czasem serki klinki, ale nasze były dwa razy większe i przebijały w nich kremowe pasma dobrej prawdziwej śmietany.

Wyraczyć. Wytrzeszczyć (oczy). *Waczyska na jaho wyraczyŭ. Wyraczyŭsa na jaje jak jaki źwier. Czaho wyraczyŭsa?*

Łoni. W zeszłym roku. *Heta było łoni.*

Żmienia. Garść. *Żmienia naszych słoŭ. Żmienia krupy. Żmieńka szczaścia*.

Kroŭ. Krew. *Heta nasza kroŭ.*

Trymajciasa, naszy słowy! Daję wam życie w moich szkicach

Tamara Bołdak-Janowska

Гумарэска

Абмежаванні

Я – небяспечны чалавек. Опасный мужчина. Калі паяўляюся ў іншай краіне – чакай ад мяне неадпаведных паводзін (гвалтаванне, падчэпліванне малалетак рознага полу, знявага цнатлівых кабет) і лепш было б мяне ўвогуле не пускаць за мяжу, а калі так – дык з маёй памяркоўнай і разумнай кабетай, якая ўтаймуе мае непрыстойныя схільнасці і жарсці словам ці качалкай.

Але што ж зробіш – адпускае мяне мая любая нават у блізкае замежжа, нават і далейшае. Бо ж з мяне такі вандал, калі не праветруся. Закісну, дык з мяне чэрці валам лезуць. Шалею, як задоўга месца засяджу. Дык, скажам, пусціць мяне мая жонка на Беларусь. Да сваякоў. Сваю машыну мы ўжо пазбыліся, дык на аўтобусе ці са знаёмымі. Так і цяпер выбраўся быў, у Гродна. А на мяжы – загвоздка. Усё маю: і пашпарт, і багаж як трэба, без боерыпасаў ды наркотыкаў ці чаго там падазронага, разам з літаратурай (можа, і „Ніва” падпольнай лічыцца, бо вершы ў ёй друкуюцца няшведскага Шведа пра тое, каб нашай мовы не пакідаць, каб не ўмёрлі?!), а тут паглядзелі на мяне пагранічнік з мытнікам, паўзіраліся нават і ў вочы за сетачкай маршчын, і пытаюцца:

– А дзе ў вас тры прэзерватывы?

Думаю, прыколваюцца дзядзькі. А да іх яшчэ і маладая мытніца падышла, строга, звёўшы бровы, проста мне ў вочы паглядзела: не ўпусцім у нашу рэспубліку такога еўрапейца, каб без трох, прынамсі, прэзерватываў быў. Ці стары, ці малады, ці сексуальна заклапочаны ці не, ці гомапэўны, ці гоманяпэўны, сатырык ён ці трагічны паэт.

Мне, як, скажам, сатырыку ў маім узросце, дык тыя прэзерватывы на шары, бо мне, мабыць да лямпачкі тыя непрыстойныя ці багабоязныя паводзіны мае еўрапейскае персоны і іншых. Мабыць, каб ехаў аўтобусам у тое Гродна, пра гэта не пыталі б? А шафёр кажа: „У Італію трэба мець з сабою асцерагальны трохкутнік, атэчку, камплект запасных лямпачак і наклейку „PL” (вядома, на аўто). Яшчэ: бела-чырвоную адблескавую плітку (50 х 50 см), якую можна начапіць на выстаючым па-за машыну элеменце (дошка, байдарка, ровар), задняе люстэрка з правага боку аўтамабіля, вогнетушыцель. У Харвацыю – да таго ўсяго яшчэ буксірны трос, а нельга мець з сабою дадатковую банку з палівам, а ў той Турцыі – аж тры асцерагальныя трохкутнікі”. Мне ўжо асацыюцца тыя трохкутнікі з чымсьці непрыстойным... Узяў бы тыя прэзерватывы, каб ведаў. Не скарыстаў бы, пасля знайшла б... іх у багажы... мая жонка. Божа мой! Але справы сямейныя – гэта вам не памежная і ўнутраная палітыка!

Не пусцяць мяне ў Гродна! — забілася мне ў галаве. Назад паеду! Але сусед дастаў са свае сумкі камплект пахучых ружовых, ужо з выгляду кайфовых кандомаў. І пазычыў мне, старому. *Для яй*, – кажа, – даю вам іх назаўсёды.

Ды не, аддаў я яму іх зараз пасля пераезду мяжы. Крыху шкада – хоць панюхаў бы час ад часу...

Міра Лукша

Незабыўны публіцыст і прыяцель „Czasopisa”

Калі ў 1990 годзе пачаў выходзіць „Ч”, Мікола Гайдук вёў якраз заняткі па беларускай мове для моладзі пры царкве Усіх Святых на праваслаўных могілках у Беластоку – Выгодзе. Праз удзельніка тых жа ўрокаў запрапанаваў, што ахвотна нам дапаможа ў рэдактарскай працы. „Няхай яны дадуць мне беларускія тэксты, то я іх папраўлю”, – сказаў. Мы ахвотна згадзіліся, бо самі яшчэ толькі вучыліся добра пісаць, і не толькі па-беларуску, але і па-польску. Хаця якраз паканчалі ўніверсітэты ці палітэхніку, то аўтарамі былі мы тады, на жаль, яшчэ надта слабымі.

Мікола Гайдук правіў нам беларускамоўныя тэксты, а з часам і сам пачаў іх пісаць. „Часопіс” успрыняў станоўча – як карысную і надзейную ініцыятыву маладога пакалення польскіх беларусаў. „Адной „Нівы” ўжо мала, каб дайсці да нашых людзей з беларускай тэматыкай”, – гаварыў. Неабходным лічыў рабіць тое і на польскай мове. „Няважна з кім, няважна дзе, але ўсякімі метадамі трэба змагацца за беларускасць”, – паўтараў.

Сам, аднак, у „Часопіс” пісаў выключна па-беларуску. Найперш у верасні 1994 г. пачаў штомесяц складаць календарыум, прыпамінаючы істотныя даты з беларускай мінуўшчыны, пачынаючы яшчэ з ранняга сярэднявечча. Падабраў таксама імёны і святы ў наш штогадовы каляндар. Гэтым тэкстам карыстаемся па сёння.

Мікола Гайдук часам стаў нашым найбольш плённым аўтарам. Нідзе – ні ў „Przegląd Prawosławny”, ні ў царкоўныя выданні – не пісаў так шмат артыкулаў, як у „Часопіс”. У нашым выданні таксама нанова аднайшоў ён сябе як беларускага асветніка. З канца 1996 г. у кожны нумар апрацоўваў укладыш „Аб нашым мінулым”, накіраваны найперш для школьнікаў і ліцэістаў. Быў гэта проста падручнік – з практыкаваннямі ў канцы кожнай тэмы – па гісторыі Беларусі, з вялікім націскам на Беласточчыну, як карэнную яе частку. На жаль, паспеў апісаць падзеі толькі да пачатку XVI стагоддзя.

Коратка перад смерцю ўзяўся яшчэ і за „Хроніку мясцовасці” – пастаянную рубрыку на апошняй старонцы з малюнкамі Уладзіслава Петрука – якую раней рыхтавалі Дарафей Фіёнік і Вячаслаў Харужы.

Мікола Гайдук бываў вельмі часта ў нашай рэдакцыі, якая тады знаходзілася па вул. Суражскай, у славутым у час Народнай Польшчы Доме прэсы, спярша ўнізе, пасля на другім паверсе. Пунктуальна прыносіў свае тэксты. Пісаў іх на машынцы і рабіў гэта вельмі акуратна. Беларускай мовай валодаў перфекцыйна. Так добра пісаць па-беларуску як ён – не ўмеў і не ўмее больш ніхто. Прытым у сваёй беларушчыне пазбягаў саветызмаў, якія да сёння з’яўляюцца атрутай для сапраўднай беларускай мовы. Яго беларушчына – гэта цалкам не тая штучная беларуская нова-мова, якую чуем напрыклад сёння па радыё з Беластока.

Для Мікалая Гайдука „Часопіс” тады быў важным месцам. Нашае выданне дазваляла яму працягваць публіцыстычную працу і надалей мог быць актыўным аўтарам. Нягледзячы на свой пажылы ўжо ўзрост і праблемы са здароўем, увесь час шмат працаваў. Вось як падвёў быў 1995 год у апытанні, якое мы зрабілі тады ў сваім асяроддзі:

„У маім асабістым жыцці мінулы год быў даволі плённы: выйшлі дзве кнігі – нарыс „Берасцейская унія 1596 г.” і пераклад на польскую мову кнігі Ю. Лабынцава і Л. Шчавінскай пра ролю Заблудава ў беларускім і ўсходнеславянскім пісьменстве. Узяўся я таксама апрацоўваць матэрыял на кнігу „Легенды Беластоцкай зямлі”, пачаў пісаць праект падручніка (папулярнай



Фота Міры Лукшы

Частка літаратурнай і публіцыстычнай спадчыны Міколы Гайдука, прэзентаваная падчас чэрвеньскай канферэнцыі ў Бельску-Падляшскім

кніжкі) „Гісторыя беларускага народа” з улікам нашага, беларусаў Беласточчыны, гаротнага лёсу; далей цягнуў розныя цыклы ў „Часопісе”, „Ніве”, „Przeglądzie Prawosławnym”, рыхтаваў „Фос” – словам, корпаўся па ранейшаму, але здароўе пагоршылася”.

На старонках „Часопіса” Мікола Гайдук публікаваў таксама свае апавяданні, асаджаныя зместам у мінулым, як „Крамола” з рэаліямі XIII-га стагоддзя на Гарадзеншчыне.

Так склалася, што ў выданні некаторых кніжак Міколы Гайдука і я таксама меў свой удзел як іх тэхнічны рэдактар. Рыхтаваў я ў друк між іншым „Легенды Беласточчыны”, падборку беларускай рэлігійнай паэзіі „Храм і верш”, таксама квартальнік „Фос”, які на беларускай мове тарашкевіцай выдавала Брацтва праваслаўнай моладзі ў Беластоку, а Мікола Гайдук перакладаў напісаныя па-польску тэксты.

Седзячы пры камп’ютарнай вёрстцы з Мікалаем Гайдуком я пазнаёміўся бліжэй. Для мяне стаў ён проста старэйшым прыяцелем і настаўнікам. Дзякуючы яму я навучыўся сяк-так правільна пісаць па-беларуску. Падчас нашых сустрэчаў распавёў мне ён шмат чаго пра сваё жыццё, асабліва пра жыццёвы досвед. Вучыў мяне пакорлівасці і пераконваў, што ўсё патрабуе часу. З халодным спакоем глядзеў на беларускую дзяржаву, якая так нечакана ўзнікла нават для яго самога. Пагрозу для беларускай незалежнасці бачыў, аднак, не ў заўважальнай ўжо тады дзікай дабравольнай русіфікацыі, але ў рэваншызме палякаў, які паводле яго ніколі не згасне, бо „палякі ніколі не пагодзяцца са стратай тэрыторый на ўсходзе”. Цікава ці памяняў бы гэты погляд цяпер, калі Польшча ад амаль дзесяці гадоў знаходзіцца ў Еўропе без межаў...

Мікола Гайдук „Ч” вельмі цаніў і паважаў. Заўсёды абавязкова выказваў свае ацэнкі і заўвагі наконт новага нумара як толькі выйшаў ён з друку. 21 снежня 1996 г. на з’ездзе Асацыяцыі беларускіх журналістаў – арганізацыі, якая да сёння з’яўляецца афіцыйным выдаўцом Часопіса – быў выбраны членам ўправы тады ў восем асоб. У час дыскусіі прапанаваў, каб „Часопіс” разросся ў г.зв. „тоўсты часопіс”, які даваў бы магчымасць публікаваць большыя формы – напрыклад аповесць. Такія „тоўстыя часопісы” ўзніклі ў нас, але, на жаль, Мікулы Гайдука не было ўжо тады ў жывых. Маю на ўвазе „Annus Albaruthenicus – Год беларускі” і „Тэрмапілы”.

Калі Міколы Гайдука раптоўна не стала, у „Ч” я напісаў кароценькі ўспамін, якому даў загаловак „Пакінуў трывалы беларускі след”. Цяперашнія мерапрыемствы ў яго гонар яшчэ больш гэта пацвярджаюць. Лена Глагоўская, якая так дакладна прыгледзелася спадчыне па Міколу Гайдуку, адназначна сцвярджае, што сэнсам яго жыцця была менавіта беларускасць. Гэтай справе прысвяціў ён усё сваё жыццё.

І яшчэ незабыўны публіцыст і прыяцель „Ч” нас, маладшых, пераконваў, каб не падаць духам. Аказваецца, мы, беларусы, былі і ёсць песімістамі. Былі моманты, калі і я пераставаў верыць у сэнс сваёй працы на беларускай ніве. Калісьці пажаліўся быў спадару Гайдуку: „А каму калісь усё тое будзе патрэбнае...”

„І мы ў „Ніве” таксама калісь так думалі, – адказаў мне. – Мы былі перакана违ны, што маладых беларусаў больш не будзе, што на нас скончыцца „Ніва”. А тут і „Часопіс” з’явіўся, і радыёперадачы, тэлеперадачы, разгарнуўся выдавецкі рух...”

Юрка Хмялеўскі

За хлебам...

Раней у Англію выехаў мой старэйшы брат. Пасля забраў туды нашых бацькоў. У Польшчы засталіся толькі я – Магда, без работы, цяжарная другім дзіцём, з мала стабільным партнёрам побач. Хацела далучыцца да сям’і і доўга намаўляла свайго Міхася.

– Там ёсць усе мае блізкія, – тлумачыла яму. – Тут зарабляеш малыя грашакі, а другое дзіцё ўжо ў дарозе, – і клала далонь на сваім жываце...

– Зноў мне выгаварваеш, што мала зарабляю, а сама ў жыцці і дня не працавала?! – агрызаўся Міхась.

Не працавала, бо вельмі яму давярала і ва ўзросце семнаццаці гадоў зацяжарыла.

– Маюць там лепшую сацыяльную дапамогу, будзе нам лягчэй, – я далей пераконвала Міхася.

Праз нейкі час угаварыла яго і паехалі мы ў Англію. Міхась дастаў работу ў той фабрыцы, дзе працаваў мой брат Ян, удалося нам дастаткова хутка наняць малую але ўтульную кватэру. Міхась, хаця вельмі супраціўляўся перад выездам, раптам расцвіў.

– Чаго я, дурны, так баяўся? Ёсць тут выгадна і добра! – захапляўся, папіваючы піва.

Менавіта. Піва. Любіў піва, як я памятаю, але ў Англіі рашуча перабольшваў з алкаголем. Неўзабаве пачаў мяне біць, прымушаць да сексу, а кватэру трактаваў як гатэль. Спалучалі нас толькі дзеткі. Нашае каханне было татальнай памылкай. Цяжка было да гэтага прызнацца і адысці.

Шчасцем было, што я мела тут сваю сям’ю. Яны памаглі мне паверыць, што жыццё без Міхася будзе лепшым для мяне і маіх дзяцей.

– Дасі сабе рады, пабачыш, – брат дадаваў мне адвагі.

Вымушаная я была навучыцца новага жыцця. Бывала, што мяне гэта ўсё перарастала, але ўсё ішло на паправу,

да лепшага. Не магла сказаць аб сабе, што адбудавала даўнюю ўпэўненасць у сабе і аптымізм.

– Я зусім безнадзейная, – жалілася я Касі, сярдэчнай сяброўцы, з якой пазнаёмілася ў Англіі. – Сапсавала я сабе жыццё назаўсёды. Адчуваю сябе старухай і адкінутай.

– Не перабольшвай, – Каська ківала галавою. – Бачу, усё ж, што тут трэба прымяніць спецыяльную тэрапію.

Гэта яна завяла мяне да цырульніка, памагла купіць новую вопратку. Давала мне надзею, што напаткае мяне штосьці добрае і буду яшчэ шчаслівай.

– Знойдзеш кагосьці, але да гэта трэба імкнуцца і хацець! – гарантавала Каська і ўсміхалася лёгка кончыкамі вуснаў.

Каська канчаткова намовіла мяне на супольнае выйсце. З румянцам на твары вайшлі мы ў клуб з гучнай музыкай і тлумам людзей. У сваім жыцці я не бачыла ў адным месцы столькі так сексоўна апранутых дзяўчат. Я не падыходзіла да гэтых людзей і месца ў клубе. Я не шукала прыгоды, таму не надта шыкоўна была апранутая на гэтую імпрэзу, і цяпер адчувала сябе тут як брыдкае качанё. Тым больш задзіўляла мяне зацікаўленне маёй асобай аднаго англічаніна. Не спускаў ён з мяне вачэй. Я была ўпэўнена, што гутарыць са сваім суседам якраз пра маю асобу. Ахапіў мяне пярэпалах.

– Каська, загадваю эвакуацыю, нейкі тып пастаянна на мяне вырачвае вочы! – шапнула я ў вуха сяброўцы.

– Пакажы, катораму так падабаешся! Усміхніся яму, гэта яшчэ не згода на бог ведае што!

Я наперакор сабе, перапалохана, паслала гэтаму чароўнаму брунету сціплую ўсмешку. Ён устаў і накіраваўся ў нашым напрамку.

– Гэй, я Овен! – працягнуў руку да мяне.

– Магда, – я пакланілася. А пасля пачалося! Овен штосьці гаварыў да мяне па-англійску, але я нічога не разумела. Сітуацыю ратавала дарагая Кася.

– Мая сяброўка, на жаль, не гаворыць па-англійску.

– Што ж, англійская мова Магды пэўна не горшая чым мая нямецкая...

Назаўтра трэба было няньчыць дзяцей, але я з усмешкай успамінала чароўнага англічаніна, ды трактавала ўчарашні вечар як аднаразовае здарэнне. Але Овен не дазволіў пра яго забыць. Высылаў мне эсэмэскі, адну за адной. Гэта Каська ўвапхнула Овену ў кішэню картачку з нумарам майго мабільніка. Я свае месіджы перасылала Касьцы, а яна адзвоньвала Овену, задаволеная як падлетак, з перакладзеным зместам. Потым мы супольна рэдагавалі адказы, амаль суткі мелі мы з Касяй гарачую лінію.

Пастаянна наплывалі новыя весткі, але памалу мая эмацыянальнасць уступала месца рэчаіснасці. Овен сапраўды нічога не ведаў аб маіх дзецях і турботнай мінуўшчыне. Не хацела я далей цягнуць такую гульню, сказала яму праўду ў час наступнага спаткання. Прыкмеціла нейкую заклапочанасць на яго твары. Была ўжо ўпэўнена, што дасць драпака, ды ён толькі ўсміхнуўся да мяне, пасля нешта сказаў Касі.

– Ён кажа, што гэта нічога дрэннага, – сказала мая сяброўка. – Ён хоча з табой бліжэй пазнаёміцца, але не жаніцца.

– А ты ад заўтра вучыся англійскай мове, бо мне ўжо хапае! – Каська ад стомы паваліласяна маю канапу, калі мы вярнулся дамоў. – Як жа ты з ім дагаворышся?

Менавіта гэта было маёй наступнай праблемай. Овен не толькі не ўцёк, але ва ўік-энд запрасіў мяне на шпацыр. Я адчувала, што гэты раман можа працягвацца, але ж галоўнай перашкодай было няведанне мовы. Я ўжо страціла надзею на шчаслівае заканчэнне.

– Нават калі пайду на нейкія курсы англійскай мовы, цягнуца будзе гэта месяцамі, а нават гадамі, каб можна было з ім дагаварыцца!

– Ад чагосьці трэба пачаць, не можаш сустракацца з Овенам толькі ў маёй прысутнасці. Купі слоўнік, такі, каб змясціўся ў сумцы на пакупкі.

Насіла я той слоўнік на кожнае спатканне з Овенам. Сама пачала тлумачыць эсэмэскі і мейлы ад яго. Адначасова вучылася англійскай мове. Урэшце ж мела матывіроўку! Жыла я ў Англіі больш чым год, але прабывала ў атачэнні палякаў і не адчувала націску, каб пазнаёміцца з мовай сваіх гаспадароў. Хапіла гэтага дыгнастага хлапца, каб пачаць гарнуцца на навукі англійскай мове. Лепей выходзіла вучоба маім хлапчукам. Яны лавілі кожнае слова як губкі. Олюсь мала яшчэ гаварыў, але Міколка сустрэў Овена дасканалым зваротам на англійскай мове: „Я называюся Міколка. Прыемна з табою пазнаёміцца!" Я была ў захапленні. Было мне страшна, што Овен, моцны ў абяцаннях і тэорыі, сутыкнуўшыся з маімі сынкамі, перапалохаецца. Не цаніла яго. Пачаткова быў крыху бездапаможны, збянтэжаны і не даваў сабе рады з малымі. Я бачыла, што вельмі хоча прыблізіцца да Міколкі і Олюся, што стараецца. Аказалася, што патрабуе толькі крыху часу. Дарэчы, усе яго патрабавалі, новая сітуацыя была больш натуральная. Праз чатыры месяцы Овен вельмі добра дагаворваўся з маімі хлапчукамі і наладзілася паміж імі нітка ўзаемнасці. Мае хлопчыкі любілі яго, чакалі калі прыйдзе і гарнуліся да яго. Калі захварэлі, Овен не наракаў як смаркач, што не спатыкаемся, але яшчэ памог паскорыць візіт у лекара.

– Дзеці гэта спраўды файная справа, – сказаў мне калісь, а я буду гэта памятаць да канца жыцця.

Даверыла яму. За некалькі гадоў таксічнага саюза з Міхалам і серыі памылак нарэшце адчула, што жыццё ёсць файнае, а Овен – мой адзіны. Кахала яго цэлым сэрцам...

– Запрашаю цябе на вячэру, – сказала я аднойчы з англійскім акцэнтам, які трэніравала з Каськай...

Калі дзеткі заснулі, уключыла я субтыльную музыку і на скромным посудзе паставіла на стол сваю ўлюбёную запяканку. Першы раз адважылася стварыць рамантычны настрой і даць Овену мажлівасць падумаць, што я гатова на ўсё... Цягнулі мы ціхенька віно, гутарылі, але ведалі абое, што гэта незвычайны вечар і пэўна штосьці здарыцца.. Спачатку гаварылі аб „гэтых" справах. Прынамсі столькі, колькі можна гаварыць аб сексе карыстаючыся маім слоўнікам і тэлефонам. Ведалі ўжо з размоў што любім, а чаго не, што нас накручвае, а што смешыць...

– Чакалі мы гэтага паўгода, – я нават у бляску свечак бачыла вялікія зрэнкі Овена. Быў распалены.

– Я цяпер баюся, што цябе расчарую, – прызнаўся ў сваіх пачуццях.

– Гэта немагчыма, – я пацалавала яго і стала расшпільваць гузікі яго кашулі. Адчула, што гэта ласка, секс поўны чуласці. Гэта быў баль, а я была каралевай. Овен расцалаваў мяне з ног да галавы і з галавы да ног. Знаходзілі мы на сваіх целах самыя чулыя месцы. Я адчувала сябе шчаслівай і задаволенай....

Неўзабаве будзем спраўляць другую гадавіну знаёмства. Усё вельмі добра паміж намі. Пасяліліся мы разам у доме Овена. Плануем купіць шыкоўны вясельны строй і ўзяць цывільны шлюб. І павялічыць сям'ю. Урэшце я вывучыла агнлійскую мову, магу працягваць доўгія дыскусіі з маім найлешым сябрам і каханкам. І хто б падумаў, што ў жыцці яшчэ знайду такое шчасце?

А хатка ў Г...цы стаіць пустая, чакае сваіх гаспадароў-эмігрантаў...

Сцяпан Карбоўскі

Маё супрацоўніцтва з ангельскай службай парадку

Жартаўнікі часам кажуць, што і наш лёс часам мае пачуццё гумару. „Цвярозыя" даказваюць, што гэта толькі „совпадение обстоятельств" – чаго ж варта ўсё ж пазбягаць... Але ці ж можна пазбегнуць таго, што табе наканавана?

Было ўсё гэта тады, калі здзяйсняўся І З'езд Беларусаў Свету ў Менску... Спадар Лашук запрасіў мяне к сабе на пабыўку. Гасцяваў я тады ў яго з месяц часу – хаця час той у Лондане быў асабліва „гарачы": і ў палітычным, і ў атмасферным сэнсе. Ну, бо калі я рыхтаваўся ў дарогу, дык усе мяне перасцерагалі, што Англія – гэта ж ужо поўнач, там быццам безупынная сырасць, туман і холад – таму раілі ў дарогу цёпла апрануцца. А гаварылі гэта людзі, якія Англію быццам добра ведалі... Я, па прыродзе чалавек даверлівы, а маючы на ўвазе капрызы надвор'я, дык і быў неспакойны пра лёс майго „агародчыка" – дома ж панавала празмерна цёплае і сухое надвор'е.... А я ж не хацеў, каб у маім агародчыку ўсё бездапаможна высахла без мяне...

Падарожжа ў Англію было нават выгаднае – большую частку падарожжа ў аўтобусе глядзеў я фільмы на ўнутраным экране. Назіраў з цікаўнасцю і краявіды ваколіц, праз якія мы ехалі. А калі мы ўжо апынуліся на ангельскім узбярэжжы, мяне здзівіла гара на беразе мора. Дакладней – была гэта высачэзная скала з гладкай сцяной, а ў ейным вярху, з дзесятак метраў ніжэй, у сцяне былі дзверы з выхадам на балкон. Словам, арыгінальны назіральны пункт на мора... Колькі новых, цікавых краявідаў і людзей разумных (і не толькі) сустрэць мне давялося! Пазнаёміся я тады са спадарыняй Міхалюковай (акурат тады ейны муж быў у бальніцы і ўсе ягоныя знаёмыя былі моцна занепакоеныя ягоным здароўем). А спадар Лашук напачатку нават і ўначы быў з беларускім асяроддзем у кантакце, бо ўсе былі зацікаўлены і падзеямі ў Мінску (з нагоды І Беларускага З'езду). Ну і прагнозы маіх знаёмых, якія варажылі мне, што я ў Англіі змерзну, не здзейсніліся – і тут панавала жарышча... І гэта мяне мала радавала, калі думаў пра свой агарод. Тут я, зрэшты, не меў шмат часу на ўспаміны пра хатнія справы. Лашука штодня хтосьці наведваў ды кніжак у яго было безліч, з якімі варта было пазнаёміцца. Нават давялося мне з ім у Скарынаўскую Бібліятэку заглянуць... Вандроўкай па горадзе я і сам часценька займаўся – часам за пакупкамі бегаў і месяц мінуў – а ў сваёй фірме водпуск кончыўся... Аўтобус з Польшчы, якім вяртацца дамоў мне было трэба, затрымоўваўся на станцыі Вікторыя. І так падумалася, што неабходна мне праверыць дарогу да гэтай станцыі. Нарамак дарогі я ведаў, але якраз месца ў якім я зараз быў, дзяліла даўжэзная вуліца, праз якую не было праходу. А надарыўся момант, калі на гэтай вуліцы было зусім пуста... І я спакусіўся: апынуцца на другім баку! Цяпер ужо спакойна мог імкнуцца да прадугледжанай мэты, не трацячы дарэмна часу... Але прайшоў я ледзь з

дзесятак метраў, а перада мною з пад'езда аднаго дома выйшлі два паліцыянты. Я спыніў крокі. Паліцыянты, калі са мною зраўняліся – адзін з аднгао майго боку, другі з другога – пачалі ісці са мной у маім напрамку, вядома, нічога не гаварыўшы. Мне было сорамна, ды і што ў такой сітуацыі можна б зрабіць? Тым больш, калі чалавек мовы не ведае... Ішлі мы так даволі доўга – вуліца была даўжэзная (здругога боку, здаецца, парк быў ці якіясь зараснікі, ды што да гэтага можа мець нейкі краявід?..). І гэтая прагулка, звольненым крокам, пачала нават выклікаць ува мне злосць, бо яна мела быццам нейкую бессэнсоўную мэту... Мой настрой і роздумы зараз жа змяніліся, калі я ўбачыў недзе, воддаль з нейкага пад'езда перад намі пачала выязджаць паліцэйская машына. Ну што ж, цяпер усё ясна. Але ці мой паступак аж такі сур'ёзны, каб паліцыя рабіла столькі захаду? Хацеў я глянуць на сваіх „апекуноў" што ішлі са мною з абодвух бакоў... Глянуў у адзін бок – пуста. У другі – а каля мяне нікога няма... Як гульня дзіцячая.... Затрымаўся я і... глянуў ужо за сябе. Мае апекуны не прапалі. Яны, ужо ад мяне воддаль, нейкаму прахожаму закладвалі наручнікі...

Машына пад'ехала не да мяне, а я ўжо больш не аглядваўся за сябе. Накінуў хуткасць, каб Лашук не злаваўся, што позна вяртаюся, і паімчэў да тэй Вікторы... Па дарозе мне хацелася і смяяцца, і злавацца – на сябе, вядома. Выйшла, што давялося мне стаць супрацоўнікам сторажаў гарадскога парадку. Зразумела, што парушаючы яго.

Гарачае надвор'е непакоіла мяне, калі я думаў пра свой агарод. Развітаўшыся з новымі знаёмымі і Лашуком, я вёз шмат новых кніжак – успамінаў яшчэ больш.

Недзе на нямецкай мяжы ля прыпынка я пачаў адчуваць холад. І чым бліжэй сваіх ваколіц я набліжаўся, станавілася ўсё больш дажджліва і сапраўды пачаў я мёрзнуць... Калі ўжо апынуўся дома, пабег у агарод (вядома, каб не змокнуць, прыйшлося мне адпаведна апрануцца). У агародзе лебяда і ўсялякае іншае пустазелле было вышэй майго росту. Словам, прагнозы, асабліва ўжо сяброўскія варожбы – бадай наперакор (пажаданням) аказваюцца адваротнымі.

Сёння ўсё гэта ўжо гісторыя... Хаця жартаўнікі гатовы даказваць, што гісторыя любіць паўтарацца. Па-мойму, паўтараюцца калі часцей з'явы, якія рэдка розумам падбудаваныя.... З прычыны лёгкадумнасці, зласлівасці або псіхічнай хваробы?..

Зрэшты, у падзеі свет багаты: і ў разумныя, і ў недарэчныя... Бачым гэта безупынна і амаль на кожным кроку. Бо быццам „чалавек гучыць горда"...

Анатоль Маўчун

Асоба

Наш украінец Міхайла Гайваронскі

Украінскія выданні, якія пісалі і пішуць сёння пра свайго знакамітага кампазітара і патрыёта Міхайлу Гайваронскага (1892-1949), заўсёды згадваюць 1938 год: „Особливо творчим для композитора був 1938 рік. Михайло Гайворонський опрацював білоруські народні пісні, оркестрові твори, видав ще два скрипкові твори „Прелюдія" і „Сонатіна" для скрипки з фортепіано".

Сапраўды, вялікі ўкраінскі кампазітар, музыкант, дырыжор, педагог, скрыпач, грамадскі дзеяч, капельмайстар арміі Украінскай Народнай Рэспублікі Міхайла Гайваронскі ў канцы 1930-х гадоў шмат працаваў для музычнай Беларусі. Асабліва плённым на беларускія песні быў менавіта 1938 год. Жыў тады кампазітар у Нью-Йорку. Але яго там знайшоў Рыгор Шырма і напісаў яму ліст. Беларус і ўкраінец сталі ліставацца. Так пачалося іх сяброўства. Сам Міхайла Гайваронскі быў родам з Цярнопальшчыны. Маці ведала шмат народных песень, а бацька добра іграў на скрыпцы. У іх і вучыўся будучы кампазітар музыцы і спевам.

Пасля заканчэння народнай школы, паступіў у настаўніцкую семінарыю. Там наведваў аркестр семінарыі, спрабаваў пісаць музыку.

Пасля заканчэння семінарыі Міхайла Гайваронскі пачаў працаваць настаўнікам недалёка ад Львова.

У 1914 годзе Міхайла Гайваронскі ўступае ў рады Украінскіх Сечавых Стральцоў. Там арганізуе духавы аркестр, а потым становіцца капельмайстрам войск Украінскай Народнай Рэспублікі. Піша стралецкія песні і маршы.

У 1923 годзе Міхайла Гайваронскі пакідае Радзіму і эмігрыруе ў ЗША. У Нью-Йорку ён арганізуе хор і аркестр, а таксама паглыбляе свае музычныя веды ў Калумбійскім універсітэце.

Найбольш вядомымі творамі ўкраінскага кампазітара з'яўляюцца яго сімфанічная паэма „Над Чорным морам", „Гераічная паэма", „Гуцульская рапсодыя", рапсодыі „Доўбуш", „Родная старонка мая", маршы, уверцюры, струнны



Міхайла Гайваронскі

квартэт „Маразенко”, трыа „Каламійка”, зборнік п’ес для струннага аркестра, ён з’яўляецца аўтарам багатых інструментальных твораў камернага характару, напісаў шэраг песень на словы Тараса Шаўчэнкі: „Запавед”, „Вучыцеся браты мае”, „Садок вішнёвы” і многія-многія іншыя.

Міхайла Гайваронскі пражыў усяго 57 гадоў. Ён памёр 11 верасня 1949 года ў Нью-Йорку, дзе і пахаваны.

А цяпер вернемся ў 1938 год. Часопіс „Беларускі летапіс” за кастрычнік-снежань 1938 года пісаў: „Кампазітар М. Гайваронскі скампанаваў на мяшаны хор дзве беларускія песні да слоў Максіма Танка: „Спакойна дрэмле Нарач” і „Прайдуць гады”. Гэтыя кампазіцыі запачаткавалі новы кірунак у беларускай харавой літаратуры – кірунак свабоднай творчасці, – распачатак так патрэбнай працы музычнага ілюстравання нашай паэзіі. Вялікая падзяка і чэсць слаўнаму кампазітару!”.

Паэзію Максіма Танка вельмі ўпадабаў Міхайла Гайваронскі. 10 снежня 1938 года ў Вільні выступаў хор пад кіраўніцтвам Рыгора Шырмы. Менавіта хор і выканаў упершыню кампазіцыю Гайваронскага на словы Максіма Танка. А часопіс „Калоссе” ў 1939 года адзначаў, што кампазіцыя Гайваронскага на словы Максіма Танка захоплівае свежасцю і сілай малюнка. Але дзеля гэтага трэба добра ўчытацца ў тэкст літаратурнага твора, а таксама адначасова ўслухацца ў яго вольную ілюстрацыю, каб цалкам ацаніць сінтэтычную мастацкажывапісную яркасць, дакладнасць і гармонію ўсяго паэтычна-музычнага твора. Але апрача вонкавай, так сказаць, красы, вобраз Нарачы мае, як і сам верш Максіма Танка, характэрны ўнутраны сімвалізм, які надзвычай выразна выяўляе і падкрэслівае музыка Міхайлы Гайваронскага. Той самы часопіс „Калоссе” (1939, № 1) падкрэслі-

ГЭЙ, ПАЕХАЎ СЫН ДАНІЛА

Народная

Moderato risoluto. Апр. М. О. ГАЙВОРОНСКІ

Гэй! Гэй, па-е-хаў сын Да-ні-ла ды на Русь на вай-ну, Гэй, па-кі-нуў сын Да-ні-ла ма-ла-ду-ю жа-ну. Гэй, пі-са-ла я-го ма-ці тры лі-сточ-кі да я-го: Гэй, вяр-ні-ся ты Да-ні-ла, дый да до-му свай-го! Ды ўжо твая Каця-ры-на сваю волю паня-ла: па-за-еж-джы-ва-ла ко-ні тва-е ва-ра-ны-я па-за-еж-джы-ва-ла

allargando e dim.



Хор у Нью-Йорку. Дырыжор – Міхайла Гайваронскі (у трэцім радзе ў цэнтры)

ваў, што „асабліва трэба адзначыць і музыку Гайваронскага на сільны верш Танка „Прайдуць гады”, як адзіны вынятак з усёй чыста народнай праграмы”.

Пісаў музыку ўкраінскі кампазітар і да вершаў Якуба Коласа і Паўлюка Труса. Кожны з твораў гэтых паэтаў быў прадуманы, і музыка кампазітара была цесна сплецена з тэкстамі. Пачуцці паэтаў кампазітар адбіваў і дапаўняў гармоніяй свае музыкі.


Летам 1938 года з Нью-Йорку Міхайла Гайваронскі дасылае Рыгору Шырму сем апрацаваных для хору беларускіх народных песняў. Сярод іх – „Гэй, паехаў сын Даніла”, „О-ю-ля-лю”, „Замуж пайсці, трэба знаць”. А восенню 1938 года Рыгор Шырма зноў атрымаў ад Гайваронскага пяць новых беларускіх народных песняў: „Лявоніха”, „Ой, гукнула сыраежка” (жніўная), „Ой, у полі дзве птушачкі” (рэкруцкая), „Як пайшоў Мікола” (валачобная), „Ой, ляцелі, ды два галобочкі” (валачобная). Часопіс „Беларускі летапіс” (1938, № 3, верасень) паведаміў, што „стыль і мастацкі характар апрацоўкі гэтых песняў як найболей адпавядаюць духу нашай народнай творчасці”. „Беларускі летапіс” нават надрукаваў ноты Міхайлы Гайваронскага да народных песень „О-ю-ля-лю” і „Гэй, паехаў сын Даніла”.

Рыгор Шырма і заходнебеларускія выданні ў 1930-х гадах шырока пісалі шмат пра тых, хто дапамагаў беларускай музычнай творчасці. Музычныя апрацоўкі народных беларускіх песень Міхайлам Гайваронскім ацэньваліся, як яркая гармонія, такая чыстая і спеўная, прадыктаваная народным кантрапунктам, якая ідзе побач з яснай народнай мелодыяй. Пры гэтым яны ніколі не зніжаюць песні да простага, чужога для мастацтва этнаграфізму, але разам з тым і этнаграфічных рысаў песні не мяняюць на штучныя эфекты і прыкрасы. Слухаючы беларускія песні ў апрацоўцы Гайваронскага, нават не ведаючы тэксту, мы даведаемся, што гэта звіняць валачобнікі або пяюць каляднікі. Ад кожнай беларускай песні Гайваронскага вее подыхам свежага паветра нашых лясоў і ніваў, чуецца пах сенажацяў, абмытых рачнымі хвалямі. Беларуская вёска, стагоддзямі абскубаная, гамоніць у тых гуках нячуванаю дагэтуль моваю – моваю свайго чулага і вялікага сэрца. І гэта ўсё, дзякуючы музыцы вялікага ўкраінскага кампазітара Міхайлы Гайваронскага, які пакінуў нашчадкам у спадчыну шмат цудоўных твораў, якія ўвайшлі ў залаты фонд не толькі ўкраінскай, але таксама і нашай беларускай музычнай культуры.

Сяргей Чыгрын ■



Выстава на радзіме М.Гайваронскага да яго 120-годдзя



Календарыюм

Ліпень-жнівень – гадоў таму

725 – Іпацієўскі летапіс у запісе пад 1288 г. паведамляе, што князь Уладзімір Васількавіч „поустрои церковь иконами и книгами" ў Бельску (на сучасным Падляшшы).

515 – У 1488 г. ваявода наваградзкі Аляксандар Хадкевіч засноўвае ў Супрасьлі (цяперашні Гарадок) праваслаўны манастыр, які праз два гады быў перанесены ва ўрочышча Сухі Груд на сумежжы Блудаўскай і Крыноцкай пушчаў (сучасны Супрасль).

470 – У 1543 г. паўстаў у Гародні адзін з першых аркестраў у Беларусі.

445 – У 1568 г. у Заблудаве пачала дзейнасьць першая на Падляшшы друкарня, у якой працавалі беларускія друкары Іван Федаровіч, Пётр Мсьціславец і Грынь Івановіч.

395 – У 1618 г. гетман Вялікага Княства Літоўскага Кшыштоф Радзівіл дараваў Орлі на Падляшшы прывілею, у якой гаварылася: „у маёнтку маім у ваяводзтве і павеце Бранскім ляжачым, Орля названым, фундую і закладаю мястэчка". Ягоны сын Януш пацьвердзіў дадзеныя Орлі бацькам правы і дазволіў карыстацца гарадзкім гербам.

305 – у ліпені 1708 г. швэдзкія войскі занялі Магілёў

195 – 13.07.1828 г. у Нягневічах пад Наваградкам нар. Іван Малышэўскі, гісторык царквы. Закончыў Жыровіцкае Духоўнае Вучылішча, Мінскую Духоўную Сэмінарыю і Кіеўскую Духоўную Акадэмію (1853). У 1962-1897 гг. быў прафэсарам Кіеўскай Духоўнай Акадэміі, дасьледаваў творы і жыцьцё Кірылы Тураўскага („Творы Св. Кірыла Тураўскага з апісаннем яго жыцця" (1878). Памёр 11.01.1897 г.

170 – 12.07.1843 г. у Грэфэнбэргу памёр Ігнат Даніловіч, гісторык (нар. 10.08.1787 г. у Грынявічах на Бельшчыне). Закончыў Віленскі ўнівэрсытэт (1812) і там працаваў выкладчыкам права, у 1825 – 1829 гг. – прафэсарам Харкаўскага Унівэрсытэта, у 1830-1835 гг.працаваў у Пецярбургупа падрыхтоўцы законаў для захадніх губэрняў, у 1835-1842 гг.– выкладаў у Кіеўскім і Маскоўскім унівэрсытэтах. Упершыню апісаў усе рукапісы і друкаваныя экзэмпляры Статутаў ВКЛ.

155 – 15.08.1858 г. у Гродзенскай губерні нар. Міхаіл Пліс, праваслаўны сьвятар з 1879 г. У 1919-1920 гг.уваходзіў у склад Цэнтральнай Беларускай Рады Віленшчыны і Гродзеншчыны і Беларускага Нацыянальнага Камітэту, у 1919-1923 гг.– быў законавучыцелем у Віленскай Беларускай Гімназіі, быў адным з заснавальнікаў Таварыства Беларускай Школы, выступаў за беларусізацыю праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі. Памёр 24.04.1924 г. у Вільні.

150 – 9.07.1863 г. павешаны ў Вільні Зыгмунд Серакоўскі, адзін з кіраўнікоў Студзеньскага паўстаньня.

145 – 13.07.1868 г. памёр Канстанцін Тышкевіч, гісторык, археоляг (нар. 17.02.1806 г. у Лагойску). Закончыў Віленскі унівэрсытэт (1828), у 1828 – 1836 гг. працаваў у Варшаве, удзельнічаў у паўстаньні 1930 – 1931 гг. З 1836 г. жыў у Лагойску, дзе ў 1842 г. з братам Яўстафіем залажыў першы на Беларусі музэй старажытнасьцей. Быў адным з заснавальнікаў Віленскага музэя старажытнасьцей. У 1856 г. арганізаваў экспэдыцыю па Віліі. Першы склаў тапаграфічныя планы гарадзішчаў і замчышчаў, атлас старажытных гарадзішчаў.

140 – 22.08.1873 г. у Саколцы нар. Аляксандр Багданаў (сапр. Малліноўскі), філёзаф, эканаміст, палітычны дзеяч, пісьменьнік. Па прафэсіі – лекар, з 1926 г. узначальваў Інстытут Пераліваньня Крыві ў Маскве. Загінуў 7.04.1928 г. праводзячы на сабе навуковы досьлед.

135 – 10.08.1878 г. у Пецярбурзе нар. Еўсьцігней Міровіч (сапр. Дунаеў), рэжысёр, драматург, адзін са стваральнікаў беларускага тэатра. З 1919 г. працаваў у Беларусі, у 1921-1931 гг. быў мастацкім кіраўніком І Беларускага Дзяржаўнага Тэатру. Напісаў і паставіў м. ін. п'есы: „Машэка", „Кастусь Каліноўскі" (1923), „Каваль-ваявода", „Кар'ера таварыша Брызгаліна" (1925). Памёр 16.02.1952 г.

120 – у 1893 г. на хутары Горны

Хлевіск каля Сухаволі нар. Юрка Снапко (сапр. Язэп Лявіцкі, пам. у 1916 г.), выхаванец Гарадзенскай гімназіі і Ваенна-Мэдыцынскай акадэміі ў Петраградзе, дзеяч гарадзенскага гуртка беларускай моладзі, аўтар шэрагу беларускіх вершаў: „Песьня” і „Мужык” (1912), „Доля сіроткі” (1911), „Не даў мне бацька ні багацьця...” (1913). Друкаваўся у альманаху „Колас беларускай нівы” пад псэўданімам Дзядзька.

120 – 17.07.1893 г. у Варшаве нар. Аляксандр Вэнгерка, польскі акцёр і рэжысёр. Акцёрскую кар’еру пачынаў у 1912 г. у Вільні, пазьней працаваў у тэатрах Варшавы, Кракава і Лодзі, у 1939 г. заснаваў Дзяржаўны Польскі Тэатр БССР у Беластоку. У 1941 г. арыштаваны гестапа, загінуў.

110 – 4(17).07.1903 г. памёр Мікалай Авэнарыус, пэдагог, краязнавец (нар. 31.08.(12.09.)1834 г. у Царскім Сяле). Закончыў Пэдагагічны Інстытут у Пецярбурзе. У 1864 г. заснаваў Маладзечанскую Настаўніцкую Сэмінарыю. У 1864 – 1885 гг. быў інспэктарам Александрыйска-Марыінскага Інстытуту ў Варшавае, потым Беластоцкага Настаўніцкага Інстытуту. У 1885 – 1890 гг. займаўся раскопкамі курганоў на беларускіх землях.

110 – 13.08.1903 г. памёр Фёдар Пакроўскі, археоляг (нар. у 1855 г. у вёсцы Падольскае каля Кастрамы ў Расеі). Закончыў Пецярбургскую Духоўную Акадэмію (1879), працаваў выкладчыкам Мінскага, Віленскага Духоўных Вучылішчаў. Праводзіў археалягічныя дасьледаваньні ў Беларусі, Літве і Кастрамской губерні.

110 – 14.08.1903 г. у Мінску нар. Сьцяпан Бірыла, беларускі акцёр, з 1926 г. у Беларускім Дзяржаўным Тэатры Уладыслава Галубка, з 1928 г. – у Беларускім Тэатры імя Янкі Купалы. Памёр 15.07.1975 г.

105 – 5.08.1908 г. у Парыжы памёр Валеры Урублеўскі, рэвалюцыянер (нар. 27.12.1836 г. у Жалудку каля Шчучына). Закончыў Пецярбургскі Лясны Інстытут (1857), разам з Кастусём Каліноўскім арганізаваў студзеньскае паўстаньне на Гродзеншчыне, удзельнічаў у выпуску і распаўсюджваньні „Мужыцкай Праўды”. Эміграваў у Францыю, дзе камандаваў адноў з армій Парыжскай Камуны ў 1871 г. З 1872 г. быў членам Генэральнага Савета І Інтэрнацыянала. Пахаваны каля сьцяны Камунараў у Парыжы.

100 – 14.07.1913 г. у Вільні было заснаванае Беларускае Выдавецкае Таварыства, яго ўзначальвалі Б. Даніловіч, І. Луцкевіч, К. Шпакоўскі. Надрукавала 15 кніг агульным тыражом 50 тысяч паасобнікаў – зборнікі вершаў, падручнікі па беларускай мове, п’есы для самадзейнікаў.

100 – 13.08.1913 г. у Віцебску нар. Анатоль Багатыроў, кампазітар і пэдагог, аўтар опер: „У пушчах Палесся”, „Надзея Дурава”, кантат: „Беларусь”, „Беларускія песні”, араторыі „Бітва за Беларусь”, музыкі да кінафільмаў і драматычных спэктакляў.

95 – 17–21.07.1918 г. у Маскве адбыўся ўсерасійскі з’езд бежанцаў з Беларусі. Удзельнічала 227 дэлегатаў.

90 – у жніўні 1923 г. у Віцебску на базе Народнай мастацкай школы, Віцебскіх мастацкіх майстэрняў і Віцебскага мастацка-практычнага інстытута заснаваўся Мастацкі Тэхнікум.

90 – 29.08.1923 г. у в. Бандары на Беласточчыне нар. Уладзімір Казьбярук, літаратуразнавец, пэдагог, З 1945 г. жыве ў Беларусі. Дасьледуе беларуска-польскія літаратур-

Kaliś śpiawali

Dażali żyto

Staraŭlany
A. Szczebiot

Dość wolno /18"/

1. Da - ża - li ży - to aż da hra - ni - cy, pa -
staŭ nam, pa - nie, pi - wa szkla - ni - cy.
2. my - ła har - szki, wie - sza - je na pło - ci...
Plon ŭ kop-- ku, plon.

1. Dażali żyto aż da hranicy –
Pastaŭ nam, panie, piwa szklanicy.
– Plon ŭ kopku, plon.

2. A nasza pani ŭ siwuj kapoci.
Pamyła harszki – wieszaje na płoci.
– Plon ŭ kopku, plon.

3. Kab nasza kapa jadrona była –
Pa dziesiać pudoŭ chleba wydała.
– Plon ŭ kopku, plon.

4. – Zaprahaj, panie, siwaho kania –
Jedź pa harełku aż da Krakowa.
– Plon ŭ kopku, plon

5. Dażali żyto aż da adłohu –
Padziankujemo ŭsie Panu Bohu.
Plon ŭ kopku, plon.

Sa zbornika „Biełaruskija piesni Sakolskaj ziamli”, Krynki 2012. Ad Anny Szczebiot (1921 h. naradż.) u Staralaŭnach, hm. Kuźnica. zapisaŭ 10.V.1997 h. i aprac. **Sciapan Kopa**

ныя сувязі, творчасьць Я. Коласа, дзейнасьць К. Каліноўскага, „белавежцаў”.

85 – у ліпені 1928 г. у Ленінградзе пачала стварацца кінастудыя „Савецкая Беларусь”.

80 – 26.07.1933 г. у Косаве памёр ксёндз Францішак Грынкевіч, родам з Новага Двара на Сакольшчыне (нар. 5.10.1884 г.). Закончыў гімназію ў Гародні, у 1901-1905 гг. вучыўся ў Віленскай духоўнай каталіцкай сэмінарыі, у 1905-1907 гг. – у Мітрапалітальнай духоўнай каталіцкай акдэміі ў Пецярбурзе, у 1907-1909 гг. – у Інсбруку і ў Мюнхене. Высьвячаны як сьвятар у 1907 г. У 1909 г. стаў законавучыцелем у гарадзенскай гімназіі, быў пробашчам пры кляштары брыгідак у Гародні. У 1909-1912 гг. арганізаваў і ўзначальваў Гродзенскі гурток беларускай моладзі. Супрацоўнічаў з беларускай каталіцкай газэтай „Biełarus” (1913-1915). Пасьля І сусьветнай вайны адышоў ад дзейнасьці ў беларускім руху. Пахаваны на старых каталіцкіх могілках у Гародні. Пасьля сьмерці яго імем была названая адна з вуліц у Гародні.

80 – 26.08.1933 г. Савет Народных Камісараў БССР прыняў пастанову „Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу”, на аснове якой адыходзілася ад „тарашкевіцы”.

75 – 6.08.1938 г. нар. Ігар Лучанок, вядомы беларускі кампазітар.

75 – 20.08.1938 г. расстраляны Уладзімір Пракулевіч, беларускі палітычны дзеяч (нар. у Красналуках каля Чашнікаў). Закончыў Маскоўскі ўнівэрсытэт (1912), з 1914 г. працаваў у Мінскім акруговым судзе. Быў адным з кіраўнікоў Слуцкага Паўстаньня 1920 г. З 1923 г. сакратар ураду БНР у Празе. У 1926 г. пераехаў у БССР, дзе працаваў на дзяржаўнай пасадзе. У 1930 г. арыштаваны і сасланы на 5 гадоў у Сьвярдлоўск. У 1938 г. арыштаваны паўторна.

70 – 5.07.1943 г. у Мінску падчас выбуху міны загінуў Іван Кушнер, праваслаўны сьвятар, адзін з удзельнікаў Усебеларускага Царкоўнага Сабору (30.08.-2.09.1942 г.) у Мінску, на якім абвешчана была аўтакефалія Беларускай Праваслаўнай Царквы. Нарадзіўся ў 1908 г. у Лужках на Глыбоччыне, у1930 г. закончыў Віленскую Духоўную Праваслаўную Сэмінарыю, у 1935 – абараніў магістэрскую працу на багаслоўскім факультэце Варшаўскага Унівэрсытэту. З 1934 г. быў настаяцелем праваслаўнага прыхода ў Ятвеску на Гродзеншчыне, з 1941 г. у Мінску ў Аляксандра-Неўскай царкве на Вайсковых могілках.

70 – 19.07.1943 г. загінуў у ГУЛАГу Сяргей Дарожны (сапр. Серада, нар. 25.02.1909 г.), паэт, друкаваўся з 1925 г., выйшла некалькі зборнікаў паэзіі ды перакладаў.

70 – 11.08.1943 г. памёр Хаім Суцін, мастак, прадстаўнік экспрэсіянізму (нар. у 1894 г. у Сьмілавічах). У 1907 г. вучыўся ў Мінску, у 1910 г. – у Вільні, у 1913 – 1916 гг. у майстэрні Кармона ў Парыжы. Жыў у Францыі, пісаў партрэты, нацюрморты, пэйзажы: „Кухарка”, „Жанчына ў чырвоным”, „Старая акторка”, „Пасьля навальніцы”, „Мацярынства”.

70 – 19.08.1943 г. памёр у лагеры на Поўначы Іосіф Воўк-Левановіч, беларускі мовазнавец (нар. 6.11.1891 г. на хутары Лявонаўка каля Асіповіч). У 1923 г. закончыў Петраградзкі ўнівэрсытэт, з 1924 г. працаваў у БДУ, з 1927 г. быў навуковым сакратаром Камісыі па ўкладаньню гістарычнага слоўніка беларускай мовы Інбелкульта. У 1930 г. вымушаны выехаць у Саратаў, дзе працаваў ва ўнівэрсытэце і пэдінстытуце, з 1934 г. – у Арэнбургскім пэдінстытуце. 17.09.1937 г. беспадстаўна арыштаваны і асуджаны. Аўтар шматлікіх прац па гісторыі і дыялекталёгіі беларускай мовы, м.ін. „Лекцыяў па гісторыі беларускай мовы. Уступ і фанэтыка” (1927).

55 – 9.08.1958 г. заснаваны ў Гродне Мэдыцынскі Інстытут.

55 – 14.08.1958 г. у ЗША памёр Эдзюк Будзька, беларускі паэт і дзеяч (нер. 22.03.1882 г. у Будславе), з 1906 г. друкаваўся ў „Нашай Ніве”. Быў дэлегатам І Усебеларускага Зьезду ў 1917 г. і арганізатарам беларускай гімназіі ў Будславе ў 1918 г. Пасьля ІІ сусьветнай вайны жыў у Нямеччыне і ЗША.

35 – 22.08.1978 г. памёр Піліп Пестрак, беларускі пісьменьнік (нар. 27.11.1903 г. у Сакаўцах каля Івацэвіч), друкаваўся з 1926 г. Збор твораў у пяці тамах быў выдадзены ў Мінску ў 1984 – 1986 гадах.

25 – 21-24.07.1988 г. у Віцебску адбыўся І усесаюзны фэстываль польскай песьні.

25 – у жніўні ў Гродзенскай вобласьці заснавалася Польскае Культурна-Асьветнае Таварыства імя Адама Міцкевіча.

25 – 15.08.1988 г. памёр у Лембарку Мікола Дварэцкі (літаратурны псэўданім Мікола Базылюк), беларускі паэт і дзеяч. Нарадзіўся 6.09.1903 г. у Іказьні на Браслаўшчыне, у міжваенны час дзейнічаў там у беларускім нацыянальным руху – быў старшынёй гуртка Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Іказьні, старшынёй праваслаўнай фракцыі Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі. Пасьля ІІ сусьветнай вайны жыў ў Польшчы на Узбярэжжы – у Лашцы, Штутаве, Румі, Лембаргу. Пісаў вершы на беларускай мове, якія публікаваў у „Ніве”.

25 – 22.08.1988 г. памёр у Мінску Віталь Вольскі (нар. 5.09.1901 г. у Пецярбурзе), беларускі пісьменьнік. Друкаваўся з 1926 г., аўтар п’ес: „Цудоўная дудка” (1939), „Дзед і жораў” (1940), „Несьцерка” (1941), „Машэка” (1946).

20 – 8-10.07.1993 г. у Мінску адбыўся І З’езд Беларусаў Сьвету. Удзельнічала ў ім 996 дэлегатаў беларускіх арганізацыяў з розных краінаў.

Апрацавалі **Лена Глагоўская**
і Вячаслаў Харужы

Gdzie bekasy śpiewają i czyha siła nieczysta

Czortowy Worota (Diabelskie Wrota), *Diki Łuh* (Dzika Łąka) czy *Puod Zelonym Dubom* (Pod Zielonym Dębem) to działające na wyobraźnię nazwy uroczysk w okolicach wsi Reduty koło Bielska Podlaskiego.

Bodaj każde pole, każdy pagórek i drzewo miały swoje lokalne nazwy. Mówiło się: *tam w Zeluonce* i każdy wiedział, że chodzi o chodzi o miejsce, gdzie strumyk Zielonka wpada do Orlanki i rosną potężne dęby, że *Szmerech* to lasek, porośnięty leszczyną, dzikimi malinami i jeżynami.

Nazwy te powstawały spontanicznie, zwykle od jakiejś cechy charakterystycznej i tak naturalnie,jak naturalny każdego ranka był wschód słońca nad chatami. Słońce wschodziło, zachodziło i zawsze tak było, więc tłumaczyć tu nie ma co, bo to rzeczy oczywiste dla wszystkich.

Tak jak i to, że *Pod Zelonym Dubom* coś nocami straszy. Od dawien dawna wiadomo, że to miejsce jest siedliskiem zła i zjaw potępieńców, które potrafią poplątać drogę samotnemu wędrowcowi i sprawić, że zabłądzi. Ten i ów wspominał też, że za czasów napoleońskich francuski żołnierz zakopał tu skarb. Najpewniej było to złoto, bo fosfor, który wydobywa się z bagna, świeci w nocy jak ogniki, co znaczy, że złoto jest czyszczone. To nic, że nikt nigdy żadnego skarbu tu nie odnalazł. On wciąż czeka na swój dzień i swego odkrywcę.

Do uroczyska *Zeluonka* idzie się przez *Czorny Les*. Każdy, kto tu szedł, mógł spodziewać się dziwów. Ot, na przykład żyją tu takie ptaki-bekasy. Latają nad głowami i beczą jak owce. Widział kto takie rzeczy? Nic dziwnego, że zagapieni w niebo wędrowcy gubili szlak.

Podobnie i w *Czortowych Worotach*, czyli u zbiegu dróg z Orli do Redut i Dubicz Cerkiewnych, które tworzą komunikacyjny „trójkąt". Tu też błędne dusze gubiły drogę, tym bardziej że niedaleko stała karczma. Aleksy Troc – mieszkaniec Redut – wielokrotnie opowiadał, jak pewien gospodarz po obfitym posiłku położył się na wozie i zasnął, a konie same prowadziły wóz gdzie oczy poniosą, po bagnach i wertepach. Gdy rano obudził się w obcym miejscu, przetarł oczy i stwierdził: *całą noc po wertepach prowadziła siła nieczysta.*

Jeszcze w latach 70. ubiegłego wieku pisano w lokalnej prasie o *Czortowych Worotach*: *Droga długości 1,5 km jest w czasie deszczu nieprzejezdna. Gmina Orla w tym zakresie nic nie robi. Mieszkańcy też nie przejawiają takiej inicjatywy, lepiej brnąć po błocie. Nie darmo taka nazwa pasuje do tego uroczyska. Mieszkańcy niech czekają według przysłowia: spodziewał się dziad miodu, a poszedł spać nie jedząc.*



Fot. Janusz Korbel

Czy opisywane wydarzenia mają jakiś związek z tym, że mieści się tu zbiorowa mogiła niemieckich żołnierzy z czasów I wojny światowej? Zostali zaatakowani i zabici podczas kąpieli w Orlance. Zdarzyło się kilka lat temu, że cmentarz został sprofanowany, zapewne w poszukiwaniu skarbów – a jakże! Odnaleziono zardzewiały karabin i zdjęcie żołnierza oprawione w ramkę. Poza tym mnóstwo kości, butów, strzępów ubrań, które długi czas walały się potem po polach. Dziś rośnie tam młody las.

A takie uroczysko *Steńkaruszczyna*, leżące na drugim brzegu Orlanki, naprzeciwko *Zeluonki*. Nazwa pochodzi od imienia Steńko. Kim był ten Steńko i kiedy żył, nie wie nikt. Zapewne w bardzo odległych czasach. Steńki nie ma, ale nazwa została. Kiedyś mieszkali tu strażnicy lasów dworskich. Rzeka Orlanka płynie w tym miejscu szeroko i mieszkańcy nazwali to miejsce: *Olesiowa Jama*. Zapewne od jakiegoś Olesia.

Przed wojną w Redutach mieszkało około trzysta pięćdziesiąt osób, a wieś była gwarna i tętniła życiem. Dzisiaj mieszka tu około stu sześćdziesięciu osób, w większości staruszków na emeryturze. Położona z dala od ruchliwych szlaków wioska urzeka spokojem i piękną, drewnianą architekturą. Czas zaplątany pomiędzy *Czortowe Worota* i *Zeluonkę* płynie tu inaczej. Koty wylegują się w słońcu, a staruszki pielą motykami swoje ogródki. Co stanie się z tym urokliwym zakątkiem za kilkadziesiąt lat?

W dobie gospodarstw wielkoobszarowych, unijnych inwestycji i zboża genetycznie modyfikowanego, żętego kombajnami, nie ma miejsca na *Zelone Duby*, *czortowe* ani żad-

ne inne wrota i zakopane skarby. Bekasy muszą sobie znaleźć inne miejsca do beczenia. W sąsiedniej gminie Orla Szwedzi wykupili 150 ha gruntów pod budowę ogromnego zakładu koncernu Ikea. W większości były to pola i grunty okolicznych chłopów, użytkowane z dziada pradziada.

Z pól znikają zagajniki, wodne oczka, małe poletka, a wraz z nimi znikają starodawne nazwy. Jest to proces nieunikniony, ale może warto utrwalić je choćby na papierze? Wszak pamięć o wielu z nich jeszcze jest żywa, i chociaż nie każdy pamięta te nazwy, to wybierając się samochodem do Redut usłyszałam przestrogę: „Uważaj – na rozwidleniu dróg, przy trójkącie, tam często zdarzają się wypadki. Śmiertelne”.

Ewa Zwierzyńska

Czy Białowieża powstała na miejscu dawnego cmentarza?

O początkach Białowieży praktycznie nie wiemy nic. Jeszcze do niedawna powszechnie uważano, że miejscowość zaczęła się formować na przełomie XIV i XV wieku, to jest – od momentu wybudowania w Puszczy Białowieskiej dworu myśliwskiego, przeznaczonego dla króla Władysława Jagiełły i wielkiego księcia litewskiego Witolda. Badania archeologiczne przeprowadzone w pierwszym dziesięcioleciu obecnego stulecia na terenie uroczyska Stara Białowieża ujawniły, że miejsce to było zamieszkane jednak znacznie wcześniej, natrafiono tutaj bowiem na ślady osadnictwa słowiańskiego, datowane na VIII-IX wiek.

Liczni autorzy wspominają, że po Jagielle i Witoldzie swoje dwory w uroczysku Stara Białowieża wystawiali jeszcze Zygmunt I Stary i Stefan Batory. Ale także i o tych budowlach nie zachowały się żadne konkretne informacje.

Przeniesienie łowieckiej siedziby królów polskich na nowe miejsce nastąpiło około 1594 roku. Bezpośrednim powodem przeprowadzki – jak głosi legenda – był pożar, który strawił cały dwór. Legendę tę usłyszałem w 1969 roku od leśniczego Włodzimierza Bondy, którego leśnictwo obejmowało m.in. Starą Białowieżę. Leśniczemu z kolei opowiedział ją jeden z miejscowych starców. Niestety, w tym okresie nie byłem na tyle dociekliwy, żeby poznać i zanotować jego nazwisko.

Ponieważ dawniej wierzono, że na pożarzysku przez co najmniej trzy lata nie powinno się wznosić nowych budowli, dlatego pod królewski dwór wybrano nowe miejsce, oddalone od poprzedniego o około 7-8 km. Dwór wzniesiono w obrębie obecnej Polany Białowieskiej, na niewielkim wywyższeniu na prawym brzegu rzeki Narewki (teren dzisiejszego Parku Pałacowego). Później w pobliżu dworu wykopano staw i zbudowano młyn. Dały one początek obecnej Białowieży. Należy tylko żałować, że żaden z tych obiektów nie przetrwał do naszych czasów.

Ze wspomnianej legendy dowiadujemy się również, że miejsce pod nową budowlę zostało wybrane niezbyt fortunnie, gdyż na wzgórzu istniał niegdyś cmentarz, po którym czas zatarł ślad, niemniej w ziemi



Dwór myśliwski królów polskich w Białowieży przetrwał do 1831 roku

wciąż znajdowały się ludzkie szczątki. Urzędnicy królewscy, którzy wyznaczali miejsce pod budowę dworu, o tym po prostu nie wiedzieli.

Nowy dwór przyjął dostojnych myśliwych po raz pierwszy w początku XVII wieku. Po udanych łowach radośnie w nim biesiadowano. Miejscowy wołchw (wróżbita) powiedział, że teraz ludzie weselą się na grobach, ale przyjdzie czas, kiedy na nich zapłaczą. Zmarli będą o sobie przypominać na początku każdego nowego wieku. Miejscowość, która tutaj powstanie, będzie przeżywać wtedy poważne kataklizmy. Ta przepowiednia, jak dotychczas, spełnia się.

Fatalny dla Białowieży okazał się początek XVIII wieku. W 1710 roku na Puszczę Białowieską i okoliczne tereny „spadło morowe powietrze". Białowieżanie, ratując się przed zarazą, spalili swoją wieś i królewski dwór myśliwski, a sami przenieśli się w inne miejsce na Polanie Białowieskiej. Z czasem miejscowość zaczęła się odradzać.

Wiek XIX przyniósł wyprawę Napoleona na Moskwę w 1812 roku. W wyniku działań wojennych zniszczony został m.in. dwór myśliwski wraz z innymi budynkami w jego otoczeniu. Ucierpiało także wiele chłopskich chałup, a niemalo mieszkańców straciło życie. Białowieża bardzo długo zabliźniała rany.

Nastał wiek XX – i kolejna tragedia! Rosjanie w sierpniu 1915 roku ewakuowali mieszkańców w głąb Rosji, a wojska kozackie na odchodnym spaliły niemal wszystkie budynki. Przed pożogą uchowała się jedynie wieś Podolany. Po zakończeniu I wojny światowej zdziesiątkowana ludność powróciła na zgliszcza i odbudowała swoją miejscowość.

Obecnie mamy początek XXI wieku. Czy należy spodziewać się kolejnego kataklizmu? Na razie nic go nie zapowiada, ale w poprzednich wiekach przychodził niespodzianie.

Wracając jeszcze do legendy – mimowolnie nasuwa się pytanie, czy rzeczywiście pierwsze budynki w nowej Białowieży zaczęto wznosić na miejscu zapomnianego cmentarza? Tego wykluczyć się nie da. W 1889 roku, podczas robienia wykopów pod fundamenty carskiego pałacu, który wybudowano na miejscu dawnego dworu królewskiego, natrafiono na szkielety ludzkie. Znajdowały się one w miejscu, które przygotowywano pod dużą wieżę pałacu. Ponieważ robotnicy nie bardzo wiedzieli, co z kośćmi zrobić – zsunęli je na bok i tak zostawili. Czy były to pozostałości cmentarza, o którym wspomina legenda? Prawdopodobnie nie. Na podstawie stanu zachowania szkieletów można sądzić, że pochodziły one z okresu nieco późniejszego. Uwagę naocznych świadków zwróciło to, że przy szczątkach nie znaleziono żadnych osobistych rzeczy zmarłych, nawet resztek ich ubrań.



Pałac carski, wybudowany na miejscu dawnego dworu myśliwskiego. Na szczątki ludzkie natrafiono w okolicy dużej wieży.



Dr Andrzej L. Ruprecht – to on zabezpieczył dwie czaszki znalezione w czasie wykopów pod hotel „Iwa"

Na te same szkielety natrafiono ponownie w 1966 roku, podczas wykopów pod hotel „Iwa". Znaleziskiem zainteresował się nieżyjący już dr Andrzej L. Ruprecht, ówczesny pracownik Zakładu Badania Ssaków PAN w Białowieży. Postanowił zdeponować w swoim zakładzie dwie czaszki (jedna należała do młodego człowieka, druga do około sześćdziesięcioletniego) w celu przeprowadzenia w przyszłości ewentualnych badań przez specjalistę. W 1967 roku do ZBS trafiła jeszcze jedna czaszka, pochodząca z tego samego miejsca. O ile wiem, badań czaszek jednak nigdy nie przeprowadzono.

W październiku 1966 roku powołano siedmiosobową komisję do wyjaśnienia pochodzenia znalezionych na terenie budowy hotelu szczątków zwłok ludzkich. Niestety, brak w jej łonie specjalistów (np. archeologa), nie pozwolił na ustalenie chociażby przybliżonego okresu dokonania pochówku. Komisja przeprowadziła wywiady ze starszymi ludźmi i na tej podstawie stwierdziła, że szczątki ludzkie pochodzą prawdopodobnie z końca XIX wieku. Kierownictwu budowy i inwestorowi zalecono zebranie szczątków do odpowiedniej skrzynki i przewiezienie ich na cmentarz w Białowieży celem pochowania. Nieżyją-

cy już Władysław Laprus swego czasu twierdził, że skrzynię ze szczątkami zdecydowano jednak pozostawić na miejscu, w ziemi.

Z pracy komisji sporządzony został protokół, z datą 19 października 1966 roku. Dowiadujemy się z niego między innymi, że koparka w trakcie niwelacji terenu wykopała 7 czaszek i innych części szkieletu ludzkiego. Znajdowały się one na głębokości od 1,5 do 2 m.

Należy dodać, że w trakcie rozbiórki ruin pałacu rozwożono gruz z niego po całej Białowieży. Trafiał on najczęściej na podmokłe podwórka okolicznych mieszkańców lub też na drogi polne. Zdarzały się przypadki, że wśród gruzu znajdowano kości lub nawet całe czaszki ludzkie.

Piotr Bajko

Wycieczka do Puszczy Białowieskiej w 1904 roku

Zalążki zorganizowanego ruchu turystycznego do Puszczy Białowieskiej możemy zaobserwować już w drugiej połowie XIX wieku, jednak tak naprawdę zaczął on być zauważalny dopiero w początkach XX wieku. Wycieczki zbiorowe zaczęły przybywać do Białowieży jeszcze przed I wojną światową. Organizowały je przede wszystkim oddziały Polskiego Towarzystwa Krajoznawczego, Towarzystwo Łowieckie w Poznaniu, niektóre krajowe instytucje, zakłady i szkoły, a także grona obywateli z terenów położonych niedaleko Puszczy. Jedną z takich wycieczek zorganizowało w lipcu 1904 roku Towarzystwo Ogrodnicze Warszawskie, które powstało dwadzieścia lat wcześniej i działało do wybuchu II wojny światowej.

Głównymi organizatorami wycieczki byli Kazimierz Kulwieć (1871-1943) – polski przyrodnik i współzałożyciel w 1906 roku Polskiego Towarzystwa Krajoznawczego – oraz Józef Sioma (1875-1938) – mineralog, geolog, profesor Szkoły Głównej Gospodarstwa Wiejskiego, od 1922 roku kierownik Katedry Gleboznawstwa tejże uczelni. Trasa wycieczki obejmowała nie tylko Puszczę Białowieską, ale także okolice Wigier. Nie bez powodu! Kazimierz Kulwieć dobrze znał Suwalszczyznę i darzył ją wielką sympatią. Był absolwentem suwalskiego gimnazjum, w Suwałkach poślubił też żonę, a w latach 1901-1903 dokonywał wraz z innymi przyrodnikami pomiarów jezior, należących do „systematu wigierskiego". W tej sytuacji nikogo nie zdziwi, że poznawanie ojczystej ziemi rozpoczęto od Wigier.

W drogę wyruszono 1 lipca, o godzinie 10 rano, z dworca warszawskiego kolei petersburskiej. Z 52 osób, które wpisały się na listę, na dworcu stawiły się 34 osoby. Po drodze, w Grodnie, Suwałkach i Białymstoku, dołączyły jeszcze 4 osoby, więc ostatecznie w wycieczce udział wzięło 38 osób. Ze sprawozdania z tej wyprawy, które organizatorzy zamieścili w „Ogrodniku Polskim" (nr 21/1904), wynika, że trzon wycieczki stanowiła młodzież uniwersytecka, ze szkół średnich i ich pedagodzy. Z zapisanych ogrodników ostatecznie stawił się na dworcu tylko jeden – Gebethner. Wśród wycieczkowiczów wymienia się także entomologa Hilda i znawcę roślin dra Rundo z Łodzi.



Kazimierz Kulwieć – współorganizator wycieczki do Puszczy Białowieskiej w 1904 roku

Po dokładnym spenetrowaniu Wigier, cała grupa wyruszyła 8 lipca do Białowieży. Następnego dnia była już w Bielsku, tutaj przesiadła się do pociągu, który kursował po bocznej odnodze kolejowej, i jeszcze przed obiadem dotarła do Białowieży.

Po przyjeździe do „żubrowej stolicy" uczestnicy wycieczki oddali swoje bagaże na przechowywanie i wynajętymi furmankami jednokonnymi wyruszyli długim szeregiem do Zwierzyńca, odległego o dziewięć wiorst. W tym miejscu oddajmy głos pp. Kulwieciowi i Siomie:

„Po uprzedniem porozumieniu się z p. zarządzającym Zwierzyńcem [był nim wówczas Józef Newerly – dziadek przyszłego pisarza Igora Newerlego – dop. P.B.], który dał nam przewodnika, udaliśmy się do siedziby żubrów. Tu, w poszukiwaniu tych osobliwych zwierząt, których dnia tego, bardzo upalnego, spotkać było można w miejscach cienistych, wilgotnych, przeszliśmy kilka wiorst, płosząc po drodze łosie, sarny i jelenie. Nareszcie przewodnik dał znak do zatrzymania się i spokojnego zachowywania: w oddali spostrzegł wprawnem swem okiem stado tych brodatych zwierząt.

Zbitą gromadą stały żubry w ilości trzydziestu kilku sztuk ze spuszczonymi nachmurzonymi łbami, opędzając się nerwowo napadającym je muchom, bąkom, bądź skubiąc trawę. Podążając cichutko na palcach, ze stłumionym oddechem, za przewodnikiem, zbliżyliśmy się do żubrów na jakieś 200 kroków, nim zostaliśmy przez nie spostrzeżeni. Przyglądaliśmy się sobie wzajemnie nieruchomo przez kilka minut, dopóki zbyt długie stanie naprzeciw nas nie wydało się zwierzętom widocznie podejrzanem, a może zbyt nudnem, zawróciły więc i zaczęły się oddalać. Kilku miłośników fotografii, z aparatami na pogotowiu, nie zważając na mokry, błotnisty, nie równy teren, pobiegło na przełaj, starając się zabiedz uciekającym zwierzętom drogę z przodu. W ponurej jednak gęstwinie, wobec bardzo niesprzyjających warunków optycznych, na pomyślny wynik tych fotograficznych zabiegów niewiele można było liczyć, tembardziej, iż przewodnik nasz wystąpił z opozycyą, oznajmiając, że na fotografowanie żubrów trzeba mieć specyalne pozwolenie. Wobec takiego dictum woleliśmy od zamiarów swych odstąpić.

Po wyjściu ze Zwierzyńca, część towarzystwa udała się z powrotem do Białowieży tą samą drogą, na wózkach, większość zaś, z nowym przewodnikiem, skierowała się dalszą, łukową, drogą pieszo dla bliższego zapoznania się z puszczą. Przeszliśmy nią koło 2 mil i pomimo silnego zmęczenia, nie żałowano tego. Podziwialiśmy kolosalne okazy sosen, dębów, grabów i świerków, rozkoszowaliśmy się niezrównanym aromatem puszczy, w którym obok silnego zapachu żubrówki, odczuwa się balsamiczną woń żywicy, miodu i lekki zapaszek grzyba, tak charakterystyczny w wielkich, starodrzewnych lasach.

Wśród wspomnień, rozpraw i cytat, czerpanych z niezrównanych obrazów Sieroszewskiego i opisów Glogera, poświęconych puszczy Białowieskiej, maszerowaliśmy raźnym krokiem do Białowieży, spotykając co chwila to łosia, to jelenia lub płochliwą sarnę".

Niestety, pomimo planowanego pierwotnie kilkudniowego pobytu w Białowieży, uczestnicy wycieczki, po dokładnym zapoznaniu się z rozkładem pociągów kursujących pomiędzy Białowieżą a Bielskiem, wybrali powrót tego samego dnia wieczorem. Następna okazja wyjazdu nadarzała się dopiero za dwa dni. Ponieważ większość towarzystwa była już zmęczona, a niektórych piliły obowiązki domowe i zawodowe, zdecydowano, że trzech dni na Białowieżę jednak poświęcić się nie da.



Tzw. rampa carska w Białowieży. Budynek został rozebrany w latach 20. XIX wieku

Kaziemierz Kulwieć i Józef Sioma relacjonują dalej: „W kilka godzin później jechaliśmy już z powrotem do Warszawy. W drodze porządkowano i roztrząsano wspomnienia z naszego pobytu w Wigrach i Białowieży. Puszcza, zwierzyniec, żubry, łosie i wspaniałe jelenie uprzyjemniały nam pobyt w Białowieży niewątpliwie i wraziły się w pamięci wielu pożytecznymi szczegółami. A jednak czuć było, że wspomnienia z nad jezior wigierskich były gorętsze, przyjemniejsze... Być może, że w Wigrach zepsuci zostaliśmy pięknymi, a tak swojskimi, pełnymi zadumy i powagi widokami. Zresztą i ludzie... A tyle miłych wspomnień wywieźliśmy z sobą o sympatycznej, szczerej względem nas ludności mazurskiej, z którą stykaliśmy się przez dni kilka w Wigrach, Gawrychach, Augustowie i Rajgrodzie".

Krótki pobyt w Puszczy Białowieskiej na pewno nie pozwolił uczestnikom wycieczki na dokładniejsze zapoznanie się z samą Białowieżą. Wynika to jasno z relacji organizatorów wyjazdu. Panowie Kulwieć i Sioma nie wspominają też ani słowem o pomorze żubrów, który wybuchł w Puszczy właśnie w 1904 roku. Choroba, określoną przez Konrada Wróblewskiego jako szelestnica, pochłonęła wtedy 172 sztuki.

Warto przy okazji wspomnieć, że w 1904 roku Białowieża otrzymała dwa nowe, piętrowe budynki murowane – tzw. Dom Jegierski i Dom Marszałkowski. Wzbogaciła się tym samym zabudowa Parku Pałacowego. Projektantem obu gmachów był Józef Nosalewicz, architekt Głównego Zarządu Apanaży.

O pewne przedmioty wzbogacił się w tym czasie również pałac carski w Białowieży. Zakupiono do niego za 2,1 tys. rubli stół bilardowy, wykonany w fabryce Frenberga. Tutaj trafiła także akwarela nadwornego malarza Mihály Zichego pt. „Mieszkańcy i uczestnicy polowania oczekują

przybycia imperatora Aleksandra II do Białowieży". Obraz ten,ł namalowany w 1861 roku, do tego czasu był przechowywany w carskim pałacu myśliwskim w Lisino. Do Białowieży przekazał Mikołaj II.

Trzeba również wspomnieć, że warszawscy wycieczkowicze nie byli w 1904 roku jedynymi gośćmi w Białowieży. Miesiąc wcześniej odwiedził ją biskup grodzieński i brzeski Nikanor, wizytujący prawosławną parafię białowieską. Do Białowieży zajrzał także, podczas wyprawy na Litwę z misją etnograficzną Ministerstwa Oświecenia Publicznego, arystokrata francuski, archeolog, baron Joseph de Baye. Swoje wrażenia z wyprawy opublikował on w 1905 roku w Paryżu, w formie broszury. Znajdujemy w niej również opisy Puszczy Białowieskiej i żubrów.

Piotr Bajko



Pomnik żubra w Zwierzyńcu, wystawiony na pamiątkę polowania cara Aleksandra II w Puszczy w 1860 roku. W 1915 roku został on wywieziony do Rosji, a po powrocie do Polski – przewieziony do Spały, gdzie znajduje się do dzisiaj

Jan Władysław Malkiewicz – miński lekarz Janki Kupały

Profesorowi Sławomirowi Dobrzyckiemu i doktorowi Damianowi Odyi dedykuję (H. G.)

Nie będzie dobrym lekarzem, kto nie jest dobrym człowiekiem (...), kogo nie wzrusza niedola ludzka, kto nie ma miękkości i słodyczy w obejściu, kto nie ma dość siły woli, aby zawsze wszędzie panować nad sobą

Władysław Biegański (1857-1917)

Niewiele informacji można znaleźć o doktorze Janie Władysławie Malkiewiczu. W tekście o doktorze Stefanie Kozubowskim w listopadowym „Czasopisie" w ubiegłym roku zaledwie wspomniałam o tym „wybawcy" Janki Kupały. W styczniu 1920 r. dr Jan Władysław Malkiewicz skierował poetę do Szpitala Ziemskiego w Mińsku. 13 stycznia odnieśli go tam na noszach Wacław Iwanowski, Bronisław Taraszkiewicz, Jasiński, Jerochow i inni.

Некалі Юрка Голуб, калі працаваў літкансультантам у „Гродзенскай праўдзе”, выдаваў з добрай рукі рэдактара газеты Іосіфа Багіна чатыры выпускі літаратурнага штогодніка „Галасы”. Пра гэта згадаў у эпіграме на Юрку Голуба парадыст. Усё ж, у сваіх эпіграмах аўтар застаецца гісторыкам-парадыстам. А ў эпіграме на Анжэлу Д. парадыст сказаў, што „жыць паэту з паэткай не проста”, а на Ігара Жука : „Жук насустрач – будзе рух”, а ў эпіграме на старшыню Гарадзенскай філіі Рады БНФ Сяргея Мальчыка даў слова, што „мы будзем на танкі кідацца, каб толькі жыла Беларусь”.

Смешнымі, фактычна-арыгінальнымі атрымаліся эпіграмы на грамадскіх актывістаў Гародні – Віктара Сазонава і Уладзіміра Хільмановіча. Аўтар пародыі заклікае, каб гарадзенцы лепш слухалі Сазонава, чым расійскага спевака Кабзона. А пра Хільмановіча Уладзіміра з эпіграмы я даведаўся, што для яго ў дзесяць гадзін раніцы – гэта вельмі рана, бо ён любіць паспаць, але позна кладзецца.

Вельмі прыгожымі і праўдападобнымі атрымаліся сяброўскія шаржы-малюнкі таленавітай мастачкі Марыі Кулакоўскай, якія значна дапаўняюць тэкст кнігі. Адразу можна на малюнках пазнаць гарадзенскага гісторыка Вячаслава Шведа, грамадскага актывіста і краязнаўцу Уладзіміра Хільмановіча, намаляванага на першай старонцы тыднёвіка „Ніва”, паэта і публіцыста Юрася Пацюпу, паэта Анатоля Брусевіча з пэндзлем і чорнай фарбай, гісторыка Сяргея Токця з рыдлёўкай, якой ён капае архівы Беларусі, гарадзенскага каваля Юрася Мацко і іншых славутых гарадзенцаў.

Кніга пародый і эпіграм Янкі Трацяка „Партрэты ў інтэр’еры Гародні” – гэта своеасаблівы, вясёлы гарадзенскага-інтэлігентны і творчы вернісаж Наднёмання. Застаецца нам чакаць ад аўтара новых творчых партрэтаў.

Сяргей Чыгрын ■

Jesteśmy bierni

Dwa miesiące czekałem na jakiekolwiek komentarze i reakcje białoruskojęzycznych mediów, obecnych w naszym kraju. Z nieukrywanym rozczarowaniem. Podobne wydarzenie, które by godziło w polskość, z pewnością zostałoby nagłośnione przez polskich dziennikarzy.

W naszym środowisku praktycznie bez echa przeszło jednak kwietniowe *cover story* prawicowego miesięcznika „Uważam Rze Historia”, poświęcone Kresom Wschodnim, a konkretnie Polesiu – „Polskiemu Madagaskarowi”.

Wątki kresowe od zawsze funkcjonowały w środowisku patriotycznym, jednak bodaj po raz pierwszy popularny miesięcznik bez ogródek określił to, co na temat białorusko-ukraińskiego pogranicza od dawna uważa część polskiego społeczeństwa. Tytuł pojawił się na wystawie większości saloników prasowych. Polesie, a szerzej Zachodnia Białoruś – Kresy – to polskie kolonie, którym podmiotowość nadali dopiero kolonizatorzy, czyli Polacy.

Już we wstępie do numeru zaznaczone są ramy, w których poruszać się będą autorzy wydania. „Kolonia”, „poziom cywilizacyjny”, „egzotyka”, „dzicz”, „zapaść”, „misja oświeceniowa”, „brzemię białego człowieka” – to określenia występujące we wstępie red. Andrzeja Talagi, specjalisty od Bliskiego Wschodu. No i ta fascynacja Polesiem, tak podobna do kolonialnych toposów francuskich czy portugalskich. Mamy tu ciemny lud bez narodowości („tutejsi”), żyjący pierwotnym trybem życia. Analfabetów, którym trzeba pomóc. Zapaliwszy kaganek oświecenia, wskazać tym biednym ludziom drogę cywilizacyjnego rozwoju, którą Rzeczypospolita niesie na zapadłej Rusi od kilkuset lat.

Polesie pobudzało wyobraźnię Polaków. Było bezpośrednim dowodem na rzecz narodowej wielkości – wszak tylko najbardziej rozwinięci mogli sobie pozwolić na kolonialną ekspansję. W rodzimych warunkach nie była to kolonizacja zamorska, a kontynentalna, wręcz sąsiedzka. Tubylcy okazali się przedstawicielami tej samej rasy i religii (sic!). Nie miało to jednak żadnego znaczenia – jeżeli bizantyńskim Rzymianom przez całe stulecia nie pozwalano uważać się za prawdziwych Europejczyków (zachodnich) z powodu ich wiary, tak Poleszucy byli krajanami drugiej kategorii.

W numerze przeczytamy m.in. o „Afryce nad Prypecią” (*Przed wojną zabiegaliśmy o kolonie na Madagaskarze i w Liberii, tymczasem na miejscu, tuż za rogatkami Brześcia, rozpościerała się przed nami kraina jak z afrykańskiej opowieści.*) i „Diable poleskim”, czyli wojewodzie Kostku-Biernackim, kacie Berezy Kartuskiej, który *pozostał w ich* (Poleszuków – TS) *pamięci jako surowy, ale sprawiedliwy pan i zarazem obrońca biednych*. Obrazek ckliwy jak z amerykańskiego południa z przełomu wieków. W numerze nie mogło zabraknąć również wojskowych „jezuitów” tej misji, czyli Korpusu Ochrony Pogranicza. Autor tekstu bez żenady pisze, iż celem ich istnienia było *podniesienie poziomu cywilizacyjnego autochtonów, tak aby nabrali zaufania do struktur państwowych. Następnym krokiem miała być ich dobrowolna polonizacja. Polityka ta, w du-*

żej części skuteczna, zrodziła jednak konflikty, których wcześniej nikt się nie spodziewał.

Poza tematyką kolonialną w tymże numerze „Uważam Rze” sporym zaskoczeniem dla niektórych może być tekst Olega Łatyszonka na temat oddziału „Zielonego Dębu”, będący z całą pewnością pionierskim ujęciem nieznanego szerzej w Polsce tematu białoruskiego ruchu oporu we wschodniej Białorusi w okresie międzywojennym.

Temat kolonialny przypominany był w Polsce w momentach kryzysowych „ku pokrzepieniu serc”. Biorąc pod uwagę obecną sytuację Polski w klinczu dominujących gospodarczo Niemiec i śniącej o mocarstwie Rosji, pomysł redaktorów „Uważam Rze Historia” staje się zrozumiały. To nie krzywdzący imperializm mnie zaskoczył najbardziej, a krótkowzroczność i brak głębszego rozważenia problemu w aspekcie cywilizacyjnym. Bo oto prawicowi historycy i dziennikarze wysyłają światu dwa diametralnie różne sygnały. Ten, który znamy dużo lepiej, trafiający na grunt zachodnioeuropejski, ma za zadanie obronę tradycyjnych wartości, chrześcijańskiej wiary, rodziny i konserwatywnego podejścia do spraw obyczajowych. Co się jednak dzieje, gdy tym samym dziennikarzom przychodzi rozprawiać na tematy wschodnioeuropejskie? Nagle zaczynają używać lewicowej retoryki o oświeceniu, niesieniu postępu i ucywilizowania. Czy Polacy AD 2013 zgodziliby się na propozycję ucywilizowania ze strony narodów skandynawskich? Mam na myśli obecne wyobrażenia w temacie rodziny, etyki i moralności, relacji z Kościołem. Z Poleszuków zrobiono „dobrych dzikusów”, żyjących w zgodzie z przyrodą, mimo iż jednocześnie są oni przykładnymi chrześcijanami, trwającymi od wieków w systemie patriarchalnym i konserwatywnym, darzących ogromnym szacunkiem tradycję ojców.



Pochylanie się nad problemem analfabetyzmu na Polesiu trąci XIX-wiecznym wyznawaniem scjentyzmu, potrzeby pracy u podstaw, „niesienia pomocy tym nieszczęśnikom, którzy mogą żyć lepiej”. Dziennikarze ze środowiska „Uważam Rze” doskonale zdają sobie sprawę, że zdobycze zachodniej cywilizacji, jak rewolucja obyczajowa czy nowożytny ateizm, są dyskusyjne. Zaskakuje zatem bezwiedny sposób w jakim żonglują pojęciami znanymi ze sztandarów zarówno prawicy, jak i lewicy.

Co dla „niezagospodarowanych narodowościowo” Poleszuków byłoby lepsze – „czerwona zaraza”, czy „pański but” przypomina pytanie – „na co wolałbyś chorować, na kiłę, czy gruźlicę?”. Ci ludzie, jak inni, zasługują przede wszystkim na godność. „Uważam Rze Historia” im ją odbiera. Robi to w duchu dokumentu wojewody poleskiego Stanisława Downarowicza z lutego 1923 roku pt. „Zarys programu zadań i prac państwowych na Polesiu”, który zakładał nadanie zgodnego z interesem państwa kierunku w regionie – w praktyce oznaczało to pełną polonizację. Poleszucy w krótkim czasie mieli się stać „polskim korytarzem” między narodem białoruskim i ukraińskim. Projektu nie zrealizowano z uwagi na opór miejscowej ludności, która już miała swoją kulturę, język i poczucie wspólnoty narodowej – niepolskiej.

Wydawałoby się, że akurat Polacy po 1 września 1939 roku będą narodem bardziej wyczulonym na kwestię godności, zaborów i asymilacji kulturowej. Zwłaszcza, że przez cały

okres okupacji byli traktowani przez Niemców w dokładnie ten sam sposób, w jaki przed wojną traktowali Poleszuków.

Jesteśmy bierni i to boli. Być może dlatego bywamy przez sąsiadów traktowani z lekceważeniem. Jak polskie media reagują na sformułowanie „polskie obozy zagłady”? Alergicznie, ale przede wszystkim zgodnie – mimo obiektywnych różnic światopoglądowych, interes narodowy pozostaje chroniony. Myślę, że gdyby podobny cykl artykułów pojawił się w miesięczniku niemieckim, określenia „Polska” zostałoby zastąpione zwrotem „III Rzesza”, a „Polesie” wyrażeniem „Mazowsze” czy „Lubelszczyzna”, nastąpiłaby zdecydowana reakcja polskiej opinii publicznej.

Stańmy w obronie godności Poleszuków, ich wiary, kultury, języka i przekonań, które z nimi dzielimy.

Tomasz Sulima

List otwarty

Okładka kwietniowego numeru miesięcznika „Uważam Rze Historia” wywołała we mnie oburzenie i niesmak. Przedstawiony na niej mężczyzna w stroju kolonialnym z dumą podnosi głowę. Za nim, na łódce, stoją chłopi z kopcem siana. Tytuł „Polesie, polski Madagaskar” wprowadza w temat gorączki kolonialnej I poł. XX w., Polaków czyniąc kolonialistami, Poleszuków tubylcami rodem z afrykańskiej wyspy. To skandaliczne porównanie jest jednak orężem obosiecznym. Mówiąc o cywilizacyjnym zacofaniu terytorium leżącego obecnie w Białorusi, autorzy zapominają o pewnej szerszej perspektywie. Otóż z punktu widzenia mieszkańców Europy zachodniej, wiele wyobrażeń współczesnego narodu polskiego, zwłaszcza dotyczących kwestii obyczajowych, trąci średniowieczem. Środowisko dziennikarzy i historyków prawicowych powinno być bardziej wyczulone na kwestie narodowej godności – zwłaszcza biorąc pod uwagę niemiecki wymiar nazizmu okresu II wojny światowej, nacechowanego rasizmem i godzącego w polskość.

Nie zgadzam się na tak pobieżne i krzywdzące potraktowanie tematu Polesia i jego mieszkańców, którzy nie byli „dobrymi dzikusami” pozbawionymi podmiotowości. Poleszucy są ludem głębokiej wiary chrześcijańskiej, wychowanym w tradycji prawosławnej, od wieków trwającym w systemie patriarchalnym, dla którego prawdziwym etosem było przywiązanie do ojczystej ziemi i pamięci o przodkach. Tego właśnie konserwatywnego monolitu, dziennikarze i historycy prawicowego miesięcznika „Uważam Rze Historia” dostrzec nie chcieli. Zaskakująco gładko za to przyszło im używanie w swej retoryce pojęć znanych środowisku lewicowemu – o cywilizacyjnym postępie, misji oświeceniowej czy zapaści w analfabetyzmie.

Sprzeciwiam się dyskursowi postkolonialnemu, obecnemu w polskich mediach. Uważam, że podstawową, niezbywalną wartością daną każdemu człowiekowi, jest prawo do godności. Niestety nadal żyjemy w czasach, w których musimy o nią walczyć.

Tomasz Sulima
Przewodniczący Stowarzyszenia
Dziennikarzy Białoruskich

Мікола Гайдук

Спадчыннік

Жандар прыехаў у нашу вёску, да солтыса, і загадаў пахаваць „бандыта”, што валяецца каля магілок, пад плотам. Мы не ведалі яго ні імя, ні прозвішча.

Цела невялічкае, худзенькае, скручанае ў клубок, ляжала на баку, а на лобе чарнела дзірка – на разарванай патыліцы коўзкая мазь мозгу. За плячыма скручаныя іржавым калючым дротам рукі, чорныя ад гангрэны. Шырока расплюшчанае вока здзіўлена пазірала на свет...

Старэнькі Ядам нагнуўся над трупам, раскруціў і адкінуў дрот, прыгаворваючы:

– Вызвалім цябе, дзіцятка, хоць пасля смерці.

Мігам выкапалі дол, асцярожна паклалі ў яго лёгкае, бы сухая лучынка, цела. Нехта сваёй шапкай прыкрыў твар нябожчыку. Засыпалі. Стаялі панурай грамадкай над свежай магілкаю і кожны пазіраў у іншы бок, пазбягаючы позірку другога. Ядам дрыжачым голасам, штохвіля ўціраючы парэпанай далонню няўнятныя слёзы, тварыў малітву:

– Упокой, Господзі, душу раба Твоего, імя ж его, бедненького, Табе тут толькі і ведомае, і всех усопшых сроднікоў і благадзецелёў его, і прасці ему все сагрэшэнія вольныя і невольныя і даруй яму, бездольнаму, Цараствіе Небесное...

Ахінуўся сябе знакам крыжа, грамадка моўчкі рассыпалася па сваіх хатах.

У наступную ноч згарэў Шалестуновічаў хутар.

Быў зудны канец лістапада 1943 года.

***

Раніца выдалася здаровая, звонкая, з небам на ўсходзе ледзь-ледзь надрумяненым і такой цішынёю, што чуваць было, як пахруствае жвірок пад ботамі вартаўніка. Звочыўшы на ганку каменданта, ён затрымаўся,

выцягнуўся ў струнку і прастуджаным голасам прахрыпеў: „Гут моргэн, гэр!”

Шэф адказаў на прывітанне і працягваў любавацца пагоднай раніцай, удыхваць чыстае, як крышталь, паветра і глядзець па той бок рэчачкі, што вілася побач мястэчка. Там, за надрэчнымі алешынамі, зеленелі кудлатыя хвайнякі, а за імі, пэўна...

І камендант адчуў, як усё яго здаровае цела, у роскіўце сілаў, быццам электрычным токам, працяла мужчынская пажадлівасць. Ён паспешліва вярнуўся ў сваю кватэру, дзеншчыку загадаў падрыхтаваць брычку і, з'еўшы сытнае снеданне, ускочыў на падножку вазка, потым выгодна рассеўся на задняй мяккай лаўцы, пераняўшы ад конюха лейцы, свіснуў на аграмадную альзацкую аўчарку і рушыў з камендатуры. Сабака пабег перадам у здаўна вядомым яму напрамку, а за ім зацокаў прадковамі звітны дэраш.

***

Шалестуновічы жылі на самотным хутары, воддаль вёскі і шашы, у зацішшы сасновых пералескаў.

Некалькі дбайных пакаленняў сялян паклапацілася, каб усё тут было, як звон. І клуня на два токі, і стайня, і кароўнік, і свінарнік да нават авечы загон – усё складзена ў зруб роўна, гладка. Стрэхі на іх з трасціны: кошанай пасля першых гулкаіх маразоў, што ўкоўваюць дрыгву на памост і гоні стромкай трасціны ўчыняюць даступнымі для сялянскай касы. Трасцінныя стрэхі не прагніваюць доўгія дзесяцігоддзі. Нават студня і тая з адмысловых цэментавах кругоў, з калаўротам пад драніцавым дашком і побач – карыта для вадапою. На ланцугу гойдалася дубовае, пазелянелае ад веку, вядро. Хата, вядома, на дзве паловы з зашклёным ганкам і пад бляхай. І ў хаце ўсё ведала сваё месца і знаходзілася там, здаецца, спрадвечна, з часоў, калі было выгаблевана, вытачана, выткана, выплецена.

Камендант адкрыў гэты чароўны востраў выпадкова, калі пад час аднаго з паляванняў прамок на халодным восеньскім дажджы і разам са сваімі камратамі-сябрамі трапіў на хутар Шалестуновічаў абагрэцца ды абсушыцца. Іх уразіла саліднасць гаспадаркі, чысціня, апратнасць у хаце і незвычайнай красы гаспадыня: стройная, з высокімі пышнымі грудзьмі, румянымі шчокамі, прылюдным, хаця крыху і спалоханым позіркам. Каменданту яна нечым нагадвала яго Герту: таксама маладзіцу такога ж прывабнага складу.

Тым часам гаспадыня забегала з каморы ў кухню, запахла сквараным „шпэкам”, у свяцёлцы, на стале, вышываную ў пунсовыя півоні сурвэту змяніў белы кужэльны абрус, на ім сталі рассядацца поўныя місы ды талеркі, дзвэнкнулі відэльцы, азваліся кілішкі. Гаспадар, рослы, шырокі ў плячах, але ўжо з прыкметнай лысінай, паставіў на стол гляк самаробнага, але старанна выгнанага з жытняй брагі, „шнапсу”.

Яны сядзелі босыя і ў адных споднiках, бо ўсё сохла каля печы. Было вольна, лёгка, весела. За стол ледзь сілком усадавілі гаспадароў. Гаварылі ім шчыра добрыя, цёплыя словы падзякі і пахвалы. Тыя, не разумеючы іхняга гергетання, усё ж здагадваліся, што выказваюць нешта прыхільнае ім, бо надта ж часта чулася „гут”, „зэр гут” – вядомае яшчэ з маленства, яшчэ з першага прыходу сюды немцаў у тую першую нямецка-рускую вайну. Ды па позірках і ўсмешках яны бачылі, што няпрошаныя госці зычаць ім дабра. Высушаныя, абагрэтыя, сытыя і вясёлыя пакідалі хутар камендант з сябрамі познім вечарам. Гаспадар запрог у святочыня драбінкі прыткага буланчыка і закаціў іх, спяваючых і рагочучых, на самы пастарунак.

Каменданту гэтага нечаканага прывольнага застолля хапіла на некалькі тыдняў: пры кожнай згадцы пра тое каля сэрца яму цяплела, свет станавіўся яснейшы, азмрочанае жорсткасцю і крывёй жыццё святлела. Некалькі разоў ён зрываўся паехаць на той дзівосны хутар, нават сядаў у брычку, але, выехаўшы з мястэчка, па некалькі гадзін бязмэтна валачыўся па ваколіцы, аднак да Шалестуновічаў так і не наважваўся заехаць. Ён як быццам бы баяўся разбурыць гэтую чароўную здань, якая яснела ў яго свядомасці і часам яму здавалася, што нават захінала, засланяла і спіхвала на задні план вобраз яго роднага гнязда. Ён не хацеў яго спляміць, спаганіць, намагаўся ўтрымаць у чысціні, у святасці вобраз Герты, Зыгфрыда і Эльзэ – любімых дзетак, старога бацьку Пэтэра Горста. Засынаючы, ён блукаў па беразе іхняга роднага азярца, што пабліскала ў нейкай сотні крокаў ад веранды, хадзіў па старанна выграбленых жвіраваных сцежачках вакол дома, узлазіў на стромкую, зарослую сасняком ды ажыннікам суседнюю гару і адтуль любаваўся маляўнічай ваколіцай. Блукаў, як калісьці, па казарменных калідорах свае афіцэрскае школы і аніяк не выходзіла яму рашэнне задачы на выпускным экзамене.

Аднак гэтае, тутэйшае, было мацнейшае за тыя святасці – проста яно авалодала ім. І настаў дзень, раніцай якога камендант Георг Горст загадаў уставіць у брычку пацідзесяцілітровую, аплеценую лазою, бутлю нафты, нядаўна канфіскаваную яўрэю-гандляру, і паімчаўся на запаветны хутар. Брама была расчынена, і ён падкаціў пад самы ганак. Гаспадары былі на кухні, снедалі. Калі ўбачылі ў дзвярах каменданта, абое ўскочылі ад стала, гаспадар ад уражання нават папярхнуўся, і гэта так рассмяшыла нечаканага госця, што ён зарагатаў на ўсю хату. Паляпаў далонню па гаспадарскіх плячах і, калі ў таго суняўся кашаль, узяў яго пад руку, вывеў да брычкі і, паказваючы на бутлю, сказаў: „Ду німст, дэйнэт!”

Шалестуновічу не трэба было тлумачыць, што камендант надарыў яго небывала шчодра – нафта была самай дарагой і амаль недаступнай. Не прамінула і некалькі месяцаў нямецкай улады, як людзі, асабліва ў

вёсках, з-за немагчымасці здабыць яе, вярнуліся да лучыны. Унёсшы ўдвох з камендантам бутлю ў камору, Шалестуновіч запрасіў немца ў свяцёлку, а сам пабег у свіронак за бутэлькай. Жонка тым часам забразгала патэльняй. Камнедант ціха выйшаў са свяцёлкі, стаў у дзвярах кухні і сачыў, як жанчына ўвіхаецца каля пліты. Вось яна схілілася, каб падкінуць дроў у пліту, і разрэз яе кофты расхіліўся, агольваючы белыя-белыя поўныя грудзі. „Такія як у Герты" – мільганула ў думках, і ён не паўстрымаўся – рвануўся да яе і калі яна, войкнуўшы ад нечаканасці, распрасталася, упіўся вуснамі ў іх, а потым, абняўшы яе стан стаў абсыпаць пацалункамі шыю, шчокі, вочы. Яна не баранілася, а толькі быццам няхочучы, злёгку адпіхвала яго, шэпчучы: „Ман... ман..." Георг адскочыў і то ў адпаведны момант, бо сапраўды муж, загрукаўшы на ганку, з пляшкай у руцэ убег у свяцёлку. „Найн, найн!" – запярэчыў пачырванелы, разгарачаны немец. „Данкэ! Ауф відэрзээн!.." Ён выбег на падворак, і праз хвіліну брычка знікла за брамай.

Шалестуновіч не сунімаўся: „Во народ! Во людзі! Во культура! Бач, выпілі па кілішку, перакусілі крышку, а заплацілі гарою дабра!" Жонка патакнула: „Праўда ж, не тое што нашы галадранцы: і жывіну ў калхоз сагналі ды яшчэ вывезці на белыя мядзведзі абяцаліся..." Шалестуновіч напоўніў нафтай газоўку, выпрабаваў ці добра гарыць нямецкі дарунак і разам з жонкаю сталі апаражняць бутлю ў розныя бутэлькі і глякі, каб не трымаць такога – небяспечнага ўсё ж – скарбу ў адным месцы.

У тым часе Георг імчаўся на пастарунак, быццам калісьці дадому пасля спаборніцтваў ў Гогэнштайне, як яму, васемнаццацігадоваму юнцу, удалося апярэдзіць самых знакамітых наезнікаў у бэцірку і фінішаваць першым. Калі пасля гаманлівых віншаванняў, з вянком з дубовага лісця цераз плячо, прызавымі грашмі, па-мастацку абкаванай вуздэчкай і агромністым тортам, ён вяртаўся, тады з'ехаў з дарогі на лясны дукт і там, расцалаваўшы свайго загнанага да пены коніка ў шаўкавістую мызу, расплакаўся ад шчсаця. І таксама як тады, дваццаць гадоў таму назад, цяпер ён з'ехаў з шашы на лясную прасеку, абхапіў прапацелага і сапучага каня за шыю, пацалаваў яго дрыготкую мызу і... разрагатаўся на ўсё горла: гучна, звонка, па-самцоўску.

Нават увечары, ужо ў пасцелі, Георг усё яшчэ не мог пазбавіцца дзівоснага ўзбуджання із задавальнення з сябе самога. Таксама як тады, калі ўпершыню ў вусны пацалаваў Герту, а тая адапхнуўшы яго, усхліпнула, што яе бацька заб'е насмерць, як яна народзіць дзіця. „Якое? – здзівіўся ён: – Ад каго?" – „Ды ад цябе... Ты ж пацалаваў мяне..." – і зноў зарыдала. І Георг патраціў нямала намаганняў, каб пераканаць яе, што ад пацалункаў дзеці не нараджаюцца. Яна ўсё не верыла. Тады ён расшпіліў свае нагавіцы і з прарэхіываліўся мажны, напружаны, гатовы да дзеяння найбольшы мужчынскі палец. „Гэтым робяцца дзеці, а не праз вусны" – сказаў Геэорг і мацнуўшы яе пругкія грудзі-яблычкі, запрапанаваў: „Спрабуем?!." – „Найн!.. Найн!.." – заверашчала дзяўчо і з усіх ног рынулася наўцёкі.

Георг не пагнаўся за ёю. Паправіў на сабе вопратку і накіраваўся дадому.

Цяпер было яму і радасна і крыху няёмка на ўспамін пра тое здарэнне. Але і тады ён адчуваў задавальненне з сябе. Пасля некалькіх спатканняў Герта ўсё ж здалася. Адбылося тое вельмі проста, таксама як раней з той польскай парабчанкай, што на летні сезон паймалася на работу на іхняй гаспадарцы і спала сама ў летняй кухні. Наведваўся да яе не толькі ён, яле таксама і ягоны брат.

Пасля кожная сустрэча з Гертай або пачыналася, або заканчалася гэтакай забавай. Пад час вянцу пастар даволі кісла пазіраў на Герцін распухлы жывот, а нехта з прасутных у кірсе ўпаўголасу заўважыў: „Ну і здорава надзьмуў бабу!.." На трэцім месяцы пасля шлюбу ў іх нарадзіўся Зыгфрыд.

Цешыўся ён і цешыліся бацькі, і ягоныя, з-над возера, і ейныя, з-за гары. Хрысціны выправілі багатыя. Хата гудзела, бы растрывожаны вулей, а ён у той валтузні пранік цішком на летнюю кухню і забушаваў з парабчанкай. Але ж бацька высачыў ягоныя хітрыкі, узламаўся на кухню, адвалок яго голага ад парабчанкі, а на жанчыну гаркнуў, каб да раніцы яе і духу не было. Бацька – залаты чалавек. Умее сцерагчы сям'ю: да гэтага часу і слоўца нікому не пікнуў пра той выпадак.

***

У Івана і Надзі Шалестуновічаў дзяцей не было. Яшчэ да вайны яны абхадзілі ды аб'ездзілі паўсвету па цудадзейных месцах, прыкладаліся да аздараўляльных мошчаў, не скупіліся на ахвяры. І ўсё безвынікова. Калі ў роспачы Надзя разрыдалася перад адным старэнькім пустэльнікам, той зусім не суцяшаючы яе, сказаў: „Слабыя вашы малітвы, дзеткі, халаднаватыя. Да таго такая воля Божая – не супраціўляйцеся ёй". Тады яны кінуліся на дахтарах у Беласток, у Варшаву, і тыя ў адзін голас зацвярдзілі: Шалестуновіч ніколі дзяцей мець не можа, а Шалестуновічыха – хоць зараз і колькі захоча.

Сваё няшчасце Шалестуновічы разважалі доўга і глыбока, прымерваліся да рознага, але Надзі ніколі ў галаў не прыйшло кінуць шлюбнага мужа, хаця ён і казаў пра такое. Не хацелі яны і выхаванцаў браць – ні са свае радні, ні чужых. Бо як жа ж можна дапусціцца, каб такі хутарок, гэты кавалачак праўдзівага раю на зямлі, мог перайсці да чужых?!.

Урэшце, пераканаўшыся ў бязвыхаднасці, Шалестуновіч параіў жонцы пастарацца пра цяжарнасць „на баку", але з кім-небудзь чужым. Вядома, у вялікай таямніцы, каб потым дзіцяці не дакучалі злыя языкі, і не з якой-небудзь тутэйшай галотай, каб не спрабавалі часам заграбастаць хутар.

Надарыўся ж такі чалавек. Савет. Нейкі афіцэр. Шалестуновіч якраз паехаў у далёкую Крыноцкую пушчу да вывозкі, а яна была дома адна. Той зайшоў пад вечар, сказаў, што солтыс накіраваў яго сюды на начлег. Надзя прыняла начлежніка, падрыхтавала яму памыцца, накарміла, паслала ў свяцёлцы. Разгаварыліся. Яна пабедавала, што хутар ім абабралі з жывёлы, абклалі невыноснымі падаткамі, муж цэлымі тыднямі выраўляе накладзеную норму: недзе за светам Божым цягае кабаметры. Гаварыла і вачэй не зводзіла з яго пародзістага хударлявага мужчынскага твару, жылістых і касцістых рук з доўгімі і тонкімі пальцамі. І ён здагадаўся, што ад яго чакаецца. Надзя патушыла лямпу, і яны без слова ляглі разам. Савет меў ладны інструмент і ўжываў яго не ашчаджаючы. Яна ўпершыню ў жыцці спазнала асалоду быць напоўненай праўдзівай мужчынскасцю.

Пад час перадышкі Надзя спыталася, дзе яго жонка і дзеці. „По чем ты знаешь, что я женат?!" – здзівіўся ён. Яна адказала: „Па рабоце". Савет пацалаваў яе і прызнаўся, што яго жонка – лекар, жыве і працуе далёка, недзе пад Архангельскам, што ў іх двое дзяцей і трэцяе ў дарозе, што ён любіць гэткую работу, што з ёю выходзіць лепш, як з жонкай. „Але ж горш, чым з прыяцелькамі, праўда?" – нібы жартуючы, перапытала Надзя. „Смотря с какой, но с тобой – как с девицей" – зашчыраваў ён. Прачнуліся позна, але савет перад уставаннем яшчэ здорава папрацаваў. Потым яна пайшла тупаць па гаспадарцы, ён пабрыўся, памыўся, зачакаў, пакуль яна нарыхтуе сняданак. Грунтоўна пасілкаваўся, падзякаваў, абняў і пацалаваў па-руску – цвёрда, з засосам. Паабяцаў адведаць, але болей не з'явіўся.

Шалестуновічыха два тыдні хадзіла, як каралева: была болей чым пэўная, што ад такога мужчыны не можа не зацяжарыць. Але ж не зацяжарыла. Застаўся толькі ўспамін пра тую дзівосную ноч.

Калі ад вывозкі вярнуўся муж, яна згадала пра начаваўшага савета, аднак пра спробу зацяжарыць з ім нават і не ўспомніла.

Нямецка-савецкі фронт пракаціўся бокам, іх не закрануў. Шалестуновічы захадзілі пры гаспадарцы, і хутар паволі пачаў падымацца на ногі. А тут яшчэ гэты камендант трапіўся. Прылюдны, пасабяле, відаць, з гаспадаркі таксама. Шалестуновічу ён падабаўся: здаровы, прыстойны, ураўнаважаны. І неяк яму падумалася, што нядблага было б, калі б Надзя зацяжарыла з гэтым немцам. Што ж, чалавек ён чужы, пабудзе якісьці час тут, потым перавядуць яго некуды, што болей сюды і не паявіцца, а дзіця застанецца. Застанецца патомак яго, Шалестуновіча, нашчадак, спадчыннік ці спадчынніца ўсіх гэтых даброт і красы. Пэўна, яму было балюча ўсведамляць, што ён, мужчына як бык, які выцягаў з багны воз сена, якога не здолеў выцягнуць конь, не можа змайстраваць дзіцяці. Асабліва было цяжка яму глядзець на тых галадранцаў, Данілкавых: ён згорблены, у лахманах, заморany ад вечнага недаядання, яна задрыпаная, у заляпаным нямаведама чым дзіравым парцяку, з каўтунястай галавой. А дзяціскаў тых – як маку ў макаўцы, ды што год – то прыплод. А жыць няма з чаго: тры дзесяціны пяску і лапіна балота. І кожнае з дзятвы, як толькі адрастала ад зямлі, ішло ў пастушкі, потым у парабкі ці служанкі. Толькі Саветы вывелі іх з урослай у зямлю кучы ды пасялілі ў двары, выдзеліўшы ім кухню, пакой і дзве спальні. Дзяцей адзелі, абулі, выслалі ў школу, далі дапамогу. Данілчыха таксама памяняла парцяк на чыстую спадніцу, адмылася, нават пахарашэла і нарадзіла... блізнят. Аднак шчасце ад іх адкацілася разам з адыходам чырвонаармейцаў. Немцы на ўсіх ашчасліўленых Саветамі гаркнулі: „Рауз!..", занялі двор пад шульцэнамт – праўленне гміны. І вярнуліся Данілкавы з мізэрным сваім скарбам у ранейшую гнілую кучу. Шалестуновіч мо і не зларадніčаў, гледзячы на іхнюю прыгоду, але і не падумаў чым-небудзь пасобіць. Нават у наймы іх не браў, бо пайшла пагаласка, што старэйшыя Данілкавы хлопцы па начах недзе валочацца.

Гэтак, сунючыся паміж клуняй і хлявамі, Шалестуновіч і не прыкмеціў, як на падворак укацілася брычка, і камендант увайшоў у клуню ды звонка, па-сяброўску гукнуў: „Гут моргэн!" Падышоўшы да здрыгануўшага ад нечаканасці Івана, зняў пальчатку і падаў руку. Той прамовіў „Гут, гут..", хуценька абцёр сваю далонь аб палу пінжака і нясмела працягнуў яе немцу. Той хахатнуў і па-юнацку пляснуў сваёй далонню ў ягоную і моцна, па-прыяцельску яе пацiснуў, а левай паляпаў па Іванавым плячы. Пераняў з яго рук рэзгіны з сенам і, упэўніўшыся: „Фэрд?", на што Іван прытакнуў: „Я, я, каню", пакрочыў у бок стайні. Акуратна выклаў сена ў катух, пагладзіў каня па шыі і, задаволены, падаў рэзгіны Івану. Потым насіў трасянку каровам і чухаў іх за вушамі сваімі выпеставанымі пальцамі. Затым выскачыў з хлява, зняў шынель, страхнуў з яе труху, апрануўся і, пазіраючы на здзіўленага Івана, разрагатаўся: „Іх бін вір! Вір! Гаспа-дэр... Ха-ха-ха!" З прыхіліўшы да сябе Івана, накіраваўся разам з ім на ганак. Іван таксама ўсміхнуўся, а ў думках мільганула: „Ты шэльма, Георг, таксама, відаць з гаспадаркі..."

І ў хаце немец паводзіў сябе, як гаспадар: распрануўся, наліў у тазік вады, памыў і выцер рукі, прычасаўся перад люстэркам і, падкручваючы вусікі, падышоў да Надзі і цмокнуў яе ў шчаку, а, наблізіўшыся да пліты, стаў зазіраць у гаршкі.

Іван стаяў, як укапаны, сачыў за немцам і адчуваў сябе ніякавата: задавальненне і радасць захлістваліся то зайздрасцю, то нейкім жалем. У нутры яго штосьці рашылася: „Няхай... Можа з гэтага штосьці выйдзе".

Выпіўшы са дзве чаркі першаку, госць выскачыў да брычкі і прынёс вялікаваты скрутак. Разгарнуў яго на тапчане і стаў падаваць Надзі кавалкі матэрыялаў: на сукенку, кофту, спадніцу, а гаспадару падаў адзін чобат,

а другі падняў уверх падэшвай і з яго выпаў... пісталет. Іван здрыгануўся, а Надзя войкнула. Немец падаў пісталет Івану, кажучы: „Гэгэн бандытэн...” Той спачатку аднекваўся, але потым узяў збррю і запытаўся: „Патроны?..” Георг у адказ хахатнуў і падаў яму цяжкаваты пакуначак. „Данкэ, данкэ шэн...” – Іван няўклюдна кланяўся Георгу, а той падыйшоў да яго, абняў і пацалаваў у вусны: „Ду біс маін брудэр!”

Шалястуновічы праводзілі госця аж да брамы, а потым доўга пазіралі ўслед брычцы, пакуль яна не знікла за хвайняком. Думалі, відаць, аб адным і тым самым. Пераглянуліся і, не азваўшыся, пайшлі кожнае да свайго занятку.

Праз колькі дзён Іван вяртаўся з шарварку. Усцешаны, што майстар усіх раней пусціў „нах гаузэн”, ён падганяў ляйчынай каня, спадзеючыся, што за дня яшчэ нешта зробіць па гаспадарцы. У апошнюю хвіліну, ужо быўшы каля брамы, ён раптам прыкмеціў пры ганку камендантаву брычку і, спахапіўшыся, раптоўна затрымаў каня ды, павярнуўшы назад, спачатку паволі, а потым усё хутчэй паехаў прэч, на дальні палетак. Здагадкі гналіся адна за адной, раз перамала нейкае шаленчае задавальненне, што жаданае збываецца, другая – пачуццё абкрадзенага з самага дарагога і нават мільганула: „А каб з таго пісталета пакласці іх ды сябе – і канцы ў ваду...”

Георг жа, пачуўшы ад Надзі, што Іван пры „шар варэн” і вернецца „гэгэн абэнд”, не мешкаўся: расцалаваў яе, падвёў да тапчана і прыступіў да справы. Рабіў тое хутка, быццам спяшаючыся, не з такой замілаванасцю, як незабыўны ўсё яшчэ той савет, ды і інструмент у яго быў значна меншы. Але аддаліся яны сабе ўсё ж адначасова, і яна адчула, як па ўсяму яе целу прайшла далікатная дрыготка. Ён жа, як некалі савет, застагнаў, захроп і абмяк.

Праз хвіліну Георг адсопся, устаў, пахадзіў па хаце, выглянуў у акно, прысеў пры яе галаве, пацалаваў. Яна ляжала ў салодкай стомленасці. Счакаўшы, ён ізноў прыступіў да работы. Працаваў старанліва, аж краплісты пот выступіў на чале. Яна прытуліла голаў да яго вуснаў, злізала цёплыя, саланаватыя кроплі і стала смактаць кончык яго вуха...

І гадзіны не сышло, як камендантава брычка выкацілася з хутара і знікла ў пералесках. Сабака, як заўсёды, гойсаў па загонах, знікаў у гушчары, абнюхваў і паліваў кожны сустрэчны слупок.

Іван з возам поўным галля ўехаў на падворак, як ужо змяркалася. Каровы былі падоены, авечкі пабэквалі ў загоне, Надзя ўпраўлялася пры свінях. На кухні даядаў вячэру пастушок. Усё было такое звычайнае, мілае.

Ужо ў пасцелі Надзя азвалася:

– Камендант заязджаў, недзе ў полудзень.

– Заязджаў, кажаш...

– Ага...

І на гэтым іхняя размова скончылася, Іван быў задаволены, што Надзя не крыецца ад яго, і пра нішто не пытаўся. Раніцай ён прыкмеціў пад паветкай ля клуні пукаты папяровы мех. Мацнуў – соль. „Немец патрапіць адудзячыцца, – падумалася яму. – За гэтую соль сёння і ялошку набыць можна”.

Камендант Георг Горст стаў з’яўляцца на хутары ўсё часцей. І кожны раз гаспадар быў або ў ад’ездзе, або некуды неадкладна спяшаўся. І немец усё зразумеў. Цяпер рабіў сваё не спяшаючыся, рыхтоўна. А пад паветкай паявіліся калясны плуг, сеялка, касілка. Надзя раптам прыкмеціла, што месячнае ў яе не паявілася, ды такое ўжо здаралася. А калі ні з таго, ні з сяго, сцелючы на сенажаці лён, яна самлела і нават страціла на хвіліну прытомнасць, тады толькі ўпэўнілася, што напэўна зацяжарыла. Спачатку сказала пра сваё меркаванне Івану. Ён не таіў радасці, але сказаў, што трэба яшчэ пачакаць, ці то не абмылка і дадаў: „Немцу не барані – няхай сваё робіць”. І Георг стараўся. Калі яна жэстамі растлумачыла яму, што зацяжарыла ад яго, ён прыняў тое амаль абыякава. „Швангэршафт? Гут!”, расшпіліў на ёй кофту, выняў са станіка выразна папаўнелыя грудзі і, абцалаваўшы іх, злавіў адну пупышку і далікатна пасмактаў яе, потым перахапіў другую. „Эс гібт ніхт мількe”, – зарагатаў і таксама жэстамі пратлумачыў, што трэба малому накачаць малака. Ну і качаў вельмі старанна і са смакам. І гэтак доўжылася каля месяца. А калі гаспадыня папаўнела і цяжарнасць выразна абазначылася, нечакана Георг з’явіўся так, каб напэўна застаць дома Івана – прыехаў надосвітку і не сам, а ў ахове трох жандараў.

Ахова засталася на падворку, а ён, увайшоўшы на кухню, дзе гаспадары якраз снедалі, схапіў у абдымкі Надзю, расцалаваў, пагладзіў жывот, а затым абняў Івана ды як тады, уручаючы пісталет, пацалаваў у вусны. Прахрыпеў: „Ауф ведэрзэгэн, мутэр! Ауф ведерзэгэн, маін брудэр!” і знік з хаты.

Шалестуновічы выбеглі на падворак, але было ўжо пуста. Толькі там, у хвайняках, заядла брахаў камендантаў сабака, як быццам кагосьці браў, пачуліся неразборлівыя крыкі, некалькі стрэлаў.

– Палююць, – заўважыла Надзя і падалася ў хату.

Іван жа зачакаў, прыслухоўваўся, як быццам прадчуваючы нядобрае. Але брэх сабакі суняўся і на ваколіцу лягла ціш позняй восені.

Назаўтра, завозячы малако ў прыёмны пункт ён даведаўся, што ранейшы камендант паліцыі выехаў, што непадалёк яго хутара немцы злавілі якогасьці хлапца без дакументаў, мабыць савета, уцекача з транспарту. Хтосьці бачыў, як валаклі яго з брычкі з рукамі скручанымі калючым дротам і ўвапхнулі ў склеп, дзе пры жандармерыі трымалі арыштантаў. Той ды сёй скоса пазіралі на Шалестуновіча і, як ён набліжаўся, усе заціхалі. Усё гэта моцна ўстрывожыла Івана.

Вярнуўшыся ад малака, ён расказаў пра зведанае

Надзі, і наказаў ёй сысці з хутара да радні, хаця б на некалькі дзён. Тая заартачылася, сказаўшы, што са свае хаты яна і кроку не ступіць, не будзе па чужых кутках туляцца. Іван не стаў спрачацца, але кінуўся раскідваць, што дасца: расцягнуў па садзе машыны, быдла выгнаў на сенажатку і навязаў яа стога, зараўняў і заваліў ламаччом ямы з бульбаю, у сасонніку прыхаваў трохі збожжа, падвечар парасчыняў дзверы ў хлявах, дзе стаялі свінні і авечкі. Надзя, пазіраючы на мужа, таксама перавязала ў пасцілкі што важнейшае з адзежы і прыхавала пад гароднінай і бульбай у мураваным склепе на падворку. Іван не выкладаў з кішэні пісталет з патронамі. Служачы ў польскім войску, ён няблага налаўчыўся страляць і цяпер, атрымаўшы зброю ад немца, у адзін навальнічны дзень падаўся ў лес і там належна пристраляўся да падарунка. Ці ён паабяцаў сабе не аддаваць танна сваё жыццё? Мабыць, не. Іван не думаў пра сваё жыццё – паводзіў сябе несвядома, як звер, як самец, што абараняе ад смяротнай пагрозы сваю самку з малым, сваё гняздо.

Ні ў першую, ні ў другую ці трэцюю ноч ніхто на хутар не з’явіўся. Шалестуновічы рассоўвалі па болей пэўных схованках сваё дабро, а нават сёе ды тое Іван завёз да далёкага сваяка. Там некалькі ночаў перабыла і Надзя. Туды ж акружнымі палявымі ды ляснымі дарогамі Іван завёў і кароў з ялошкамі ды некалькі самых пародзістых авечак. Туды ж перакінулі ўсё лепшае з хаты ды крыху збожжа. Але ўсё было ціха, і Надзя стала журыць мужа, што ўсё гэта лішняе. Аднак муж маўчаў ды рабіў па-свойму. Жонка ўсё ж прыйшла дадому.

І тае ночы, каля поўначы, у вокны ўдарыў незвычайны бляск. Надзі падалося, што гэта ўзыходзіць месяц. Яна зірнула ў акно – з-за стрэхі клуні патыхалі языкі полымя...

– Ваня, Ваня!.. Гарым!.. – раскатурхала яна мужа.

Той сарваўся, выхапіў з-пад падушкі пісталет і захрыпеў:

– Уцякай! Ратуйся!..

– Не! – скрозь слёзы заенчыла яна.

– Уцякай! – гаркнуў ён, і ў водблісках пажару яна ўбачыла выкрыўлены лютасцю яго твар і кінулася ў камору. Там дні два таму Іван прарэзаў патайны выхад у свіронак, а з яго ў склеп і далей, ровам, можна было незаўважальна перапаўзці ў лясок.

Калі Надзя дапаўзала да першых хваін, гарэла не толькі клуня – займаліся і хлявы. Спачатку ёй здалося, што гарыць і хата, але гэта толькі водбліскі ад палаючых клуні і хлявоў адбіваліся ў крытым цынкавай бляхай даху. Стракацела стральба, з хаты таксама. Яна падпаўзла пад разгалістую хвойку і ў жаху пазірала і слухала.

– Немецкий пёс, шлюха полицейская – выходите! – пракрычаў чужы мужчынскі голас. У адказ яму Іван азваўся стрэлам. Тыя спачатку заціхлі, а потым супнулі з некалькіх месцаў. Пасля стрэлы з абодвух бакоў сціхлі, і яна пачула голас Данілкавага старэйшага, Алёшкі:

– За аднаго нашага двое заплаціце, паліцэйскі халуй з нямецкай курвай! – затрашчалі выстралы. Іван адстрэльваўся. Праз колькі часу, як клуня і хлявы ўжо дагаралі, шуганула полымя з вакон хаты.

Надзя вобмацкам выбралася з хвайняку і напрасткі, з-за слёз і цемры нічога не бачачы перад сабою, пабегла, куды неслі ногі. Толькі пад полудзень, ледзь жывая, завалаклася яна да радні.

На пажарышча немцы прыехалі толькі пасля поўдня. З імі прыбыў новы камендант – невысокі таўстун. З гатовымі да стрэлу аўтаматамі патапталіся яны па вуголлі, вакол пакарэжанай агнём дахавай бляхі і каля склепа натыркнуліся на труп Івана. Загінуў ён не ад чужой кулі – сам у сябе стрэліў, у самае сэрца.

***

Ці гэтае здарэнне мела працяг? Так, мела.

Данілкавы адразу пасля фронту выехалі ў Саветы і след па іх загінуў.

А Надзя Шалестуновіч нарадзіла сына, дала яму імя не па мужу, але па бацьку – Георгій. Перамагаючы неймаверныя цяжкасці людской помслівасці, зласлівасці і пагарды, разам з малалеткам-сынам, абапіраючыся на сваякоў, яна адбудавала хутар. Сын пасля пачатковай школы карэспандэнцыйна закончыў сельскагаспадарчы тэхнікум. Ажаніўся, як бацька, з суседавай дачкою. Надзя дачакалася ўнукаў і лягла на могілках, далёка ад Івана, пахаванага на скраю хвайняку, на відоку ў хутара. Цяпер Юры Шалестуновіч лічыцца ў гміне найлепшым гаспадаром-фермерам – абрабляе каля васьмідзесяці гектараў пакінутай іншымі зямлі і лугоў. У яго малочны статак – трыццаць галоў. Пад прасторнай паветкай стаяць: камбайн збожжавы і бульбяны, два трактары і ўсе машыны да іх, грузавік і, вядома, паланез. Старэйшы сын займаецца ў сельскагаспадарчай акадэміі ў Ольштыне, паблізу дзедавай „фатэрліш” – бацькаўшчыны. Але каля азярца, пад Ольштынкам, жыве ўжо другое пакаленне колішніх рэпатрыянтаў з-пад Баранавічаў, і пра нямецкую сям’ю Горстаў нічога не чуваць.

Калі ж вы запытаеце каго-колечы ў ваколіцах хутара ці ў мястэчку пра Шалестуновічаў, пацісне ён плячыма і здзіўлена перапытае: „А ці ёсць у нас такія?” Як пратлумачыце, пра каго ідзе гаворка, усклікне: „А-а-а! Гэта ж вы пра немца! Ну, ён у нас у вялікай пашане – старшынёю гміннай рады і старастам у царкве! А што вы думалі?!” І абавязкова, міргуўшы, шэптам дадасць: „Кажуць, маці нагуляла яго з нямецкім камендантам, а бацька з таго гора застрэліўся”. І громка заявіць: „Але ж чалавек ён рыхтоўны! От, каб нам болей такіх!..

Дагэтуль непублікаванае і праўдападобна апошняе апавяданне Міколы Гайдука, якое напісаў – спецыяльна для „Часопіса” – у палове 1998 г.



Mój wrzesień ‘39 zaczął się o tydzień wcześniej, bo już 23 sierpnia, rano, III Okręg Korpusu w Grodnie rozpoczął mobilizację. Kompanię km, 81 psg, w której służyłem jako plut.-pchor., poderwano alarmem o 4:55 z obozu ćwiczebnego na Rumlówce pod Grodnem. Po dwóch godzinach dotarłem z kompanią do koszar i tam objąłem przydzieloną mi funkcję podoficera mobilizacyjnego przy dowództwie batalionu. W ciągu pierwszych 12-tu, 24-ech i 36-ciu godzin sprawnie przeb...




Polscy Litwini spośród wszystkich społeczności mniejszościowych okazują się najmniej podatni na asymilację. Decyduje o tym wysoki stopień ich zintegrowania, do czego przyczynia się ich gospodarność i zasobność, zamieszkiwanie na niewielkim zwartym obszarze, kultywowanie tradycji, wysoki poziom religijności, kultywowanie języka ojczystego i w pełni litewskojęzyczne szkolnictwo. Spisy powszechne czy badania socjologiczne pokazują, że ponad... (dalej w następnym numerze)

Czasopis

Nr indeksu 355038, ISSN 1230-1876.
Wydawca: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich.
Adres redakcji:
Białystok, ul. Lipowa 4/221.
Adres do korespondencji:
„Czasopis”, 15-001 Białystok, skr. p. 262. **E-mail**: redakcja@czasopis.pl
http://czasopis.pl
Tel. (85) 653 79 66

Redaktor naczelny: Jerzy Chmielewski, tel. 502 661 316.
Zespół redakcyjny: Wiesław Choruży, Helena Kozłowska-Głogowska, Sławomir Iwaniuk, Tomasz Sulima (sekretarz redakcji), Jerzy Sulżyk.
Stali współpracownicy: Piotr Bajko (Białowieża), Siarhiej Czyhryn (Słonim), Tamara Bołdak-Janowska (Olsztyn), Agnieszka Goral (Lublin), Mirosława Łuksza, Janusz Korbel (Białowieża), Aleksander Maksymiuk, Jan Maksymiuk (Praga), Michał Mincewicz (Orla), Dorota Wysocka.
Druk: Orthdruk, Białystok.



Prenumerata: Odpowiednio do liczby zamawianych egzemplarzy i okresu prenumeraty należy wpłacić wielokrotność 4 zł na rachunek: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich: Bank PEKAO S.A. Białystok 30 1240 5211 1111 0000 4928 9343.

Беларускі грамадска-культурны часопіс, прысвечаны пытанням сучаснасці, гісторыі, літаратуры і мастацтва, месца чалавека ў свеце. Форум думкі беларусаў і ўсіх тых, каму блізкая беларуская тэматыка. Пазіцыі аўтараў тэкстаў не заўсёды адпавядаюць пазіцыям рэдакцыі. Не публікуюцца матэрыялы, якія прапагандуюць камуна-фашызм, расізм, нацыянальную варожасць.
Artykuły i listy publikowane są – o ile autor nie życzy sobie inaczej – w języku oryginału: po polsku lub białorusku. Redakcja zastrzega sobie prawo do skrótów, zmian tytułów i redagowania nadesłanych tekstów.

Materiałów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Administracji i Cyfryzacji.

Numer złożono 25 czerwca 2013.

XXIV ФЕСТЫВАЛЬ МУЗЫКІ МАЛАДОЙ БЕЛАРУСІ

БАСОВІШЧА 2013



BASOWISZCZA 2013 XXIV FESTIWAL MUZYKI MŁODEJ BIAŁORUSI
19–20 ЛІПЕНЯ ГАРАДОК / 19–20 LIPCA GRÓDEK

AKUTE CLOVER CLUB DIED MOROZ CONVENTION
DZIECIUKI HOPE ON ILO&FRIENDS
INDIOS BRAVOS KIM NOWAK MASALA SOUNDSYSTEM
ORKIESTRA KLEZMERSKA TEATRU SEJNEŃSKIEGO
PERKALABA POKRAK POMIDOR/OFF RE1IKT
THE TOOBES VINSENT KINIOR&ZABELOV

AFTER-PARTIES **ORIGINAL SOURCE UP TO DATE FESTIVAL** PREZENTUJE:
(START PO ZAKOŃCZENIU KONCERTÓW NA DUŻEJ SCENIE, DO GODZ. 7:00)
19.07 (PIĄTEK/SOBOTA) **TECHNOSOUL NIGHT** (MAŁA SCENA)
GOŚĆ SPECJALNY (TBA) **KREEP & NOBEL** (GRODNO, BY) **NINJA** (WARSZAWA, PL) **DTEKK & ADZ** (BIAŁYSTOK, PL)
20.07 (SOBOTA/NIEDZIELA) **BEATS. NIGHT** (MAŁA SCENA)
ED COX LIVE (BRISTOL/LONDYN, UK) **FED** (GRODNO, BY) **DEPIZGATOR** (KRAKÓW PL) **AURICOM** (BIAŁYSTOK PL)

07.06 17:00 BIAŁYSTOK, GARAGE LAND **BEFORE BASOWISZCZA** KONKURS KAPEL, KONCERT: **SAMI MUZYCY** (BIAŁYSTOK, PL) & **IQ48** (MIŃSK, BY)
18.07 21:00 MOSTOWLANY, POKAZ FILMU **"KASTUŚ KALINOUSKI"** REŻ. V. GARDIN 1927 R. MUZYKA NA ŻYWO **SIARHIEJ PUKST** (BY) PROJEKT "TUZIN NIEMAULA"
19.07 10:00 BASOWISZCZA **"PARTYZANCKI KONGRES RYSOWNIKÓW"** (48 GODZIN) AKCJA POD KIERUNKIEM **PAWŁA ALTHAMERA** (PL)
19.07 BASOWISZCZA **"KONSTANTY"** AKCJA PERFORMATYWNA **TEATR KOLEGTYW** (BIAŁYSTOK, PL)
20.07 15:00 BASOWISZCZA **"PRZYSTĄPIENIE" REKONSTRUKCJA HISTORYCZNA PRZYSZŁOŚCI** REŻYSERIA **ARTUR ŻMIJEWSKI** (PL)

NA WSZYSTKIE IMPREZY WSTĘP WOLNY FB.COM/BASOWISZCZA BASOWISZCZA.ORG НА ЎСЕ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ЎВАХОД СВАБОДНЫ

GŁÓWNY ORGANIZATOR FESTIWALU: FUNDACJA VILLA SOKRATES / WSPÓŁORGANIZATOR FESTIWALU: BIAŁORUSKIE ZRZESZENIE STUDENTÓW / ГАЛОЎНЫ АРГАНІЗАТАР ФЕСТЫВАЛЮ: ФОНД VILLA SOKRATES / СУАРГАНІЗАТАР ФЕСТЫВАЛЮ: БЕЛАРУСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ СТУДЭНТАЎ















ZADANIE WSPÓŁFINANSOWANE ZE ŚRODKÓW MINISTERSTWA ADMINISTRACJI I CYFRYZACJI
PROJEKT WSPÓŁFINANSOWANY PRZEZ DEPARTAMENT DYPLOMACJI PUBLICZNEJ I KULTURALNEJ MINISTERSTWA SPRAW ZAGRANICZNYCH W RAMACH KONKURSU WSPÓLNE DZIAŁANIA POLSKO - BIAŁORUSKIE
ZREALIZOWANO PRZY WSPARCIU FINANSOWYM URZĘDU MARSZAŁKOWSKIEGO WOJEWÓDZTWA PODLASKIEGO W BIAŁYMSTOKU
ZADANIE WSPÓŁFINANSOWANE ZE ŚRODKÓW BIAŁORUSKIEGO CENTRUM INFORMACYJNEGO














Гмінны Цэнтр Культуры ў Гарадку

Generation.by 34 MAG.NET БУДЗЬМА БЕЛАРУСАМІ! TUZIN.NIEMAULA GLOBART print Perspektywy